№ 31 (533) 23 жніўня 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

# Дзяржава прадала Velcom

Гешэфт адбыўся ў атмасфэры поўнай сакрэтнасьці. Адзін з самых ліквідных нацыянальных актываў перайшоў у арабскія рукі.

## У НУМАРЫ

**Юшчанка: «Куды падзелася беларуская мова?»**

Прэзыдэнт Украіны выказаўся супраць наданьня расейскай мове статусу другой дзяржаўнай. **Старонка 4.**

**Рубель працягвае таньнець**

На мінулым тыдні на валютнафондавай біржы попыт на даляры ЗША складаў $141,5 млн супраць $86,4 млн прапановы. **Старонка 7.**

**Дубавец: «Трэба тлумачыць, чаму тут пішам мяккі знак, а тут — «ня»**

Чаму папяровая вэрсія тыднёвіка «Свабода» выходзіць афіцыйным правапісам, а інтэрнэт — «тарашкевіцай»? **Старонка 13.**

**Драма скончылася трагедыяй**

У Бабруйску пасьля чатырох дзён пошукаў 10-гадовага хлопчыка знайшлі мёртвым. **Старонка 9.**

**Першы чэмпіянат па касьбе**

прайшоў на балоцэ ў Зьдзітаве (Бярозаўшчына). **Старонка 11.**



## Менск і Мінск

**Песьня Лявона Вольскага названая песьняю году паводле вынікаў галасаваньня ў Інтэрнэце.** **Старонка 30.**

PHOTO.BYMEDIA.NET







**АРГАНІЗУЕЦЦА ПАЕЗДКА НА БЕЛАРУСКІ ФЭСТ У ЛУЦК!**

**22 верасьня ва ўкраінскім горадзе Луцк** (Валынь) пройдзе фэст беларускага року «Права быць свабодным» з удзелам **«Нейра Дзюбель», «Крама», «Ulis», «Таварыш Маузэр», «БН», «Сьцяна»** і інш. Даведкі: 649–08–88, fest.svabody@gmail.com Т. 622–57–20.



## У пятніцу — онлайн з дырэктарам тэлеканалу «Белсат»

У пятніцу, 24 жніўня, з 15:00 да 16:00 на вашыя пытаньні на сайце nn.by будзе адказваць дырэктарка тэлеканалу «TV-Беларусь» (Белсат) Агнешка Рамашэўская.

**BE2GETHER**

**З 24 да 26 жніўня ў Літве, ля Нарвелішак, за 50 мэтраў ад беларускай мяжы, пройдзе музычны фэст «BE2GETHER».** Удзел бяруць дзясяткі гуртоў з розных краінаў, у тым ліку такія зоркі, як **«Bloodhound Gang»** і **«Morcheeba»**. Будуць беларусы **«Ляпіс Трубяцкой»**, **«Drum Extasy»**, **«IQ48»**. Музыка будзе гучаць тры дні і дзьве ночы.




## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**Якая з гэтых краінаў падаецца Вам найбольш натуральнай саюзьніцай Беларусі?**

| | |
|---|---|
| Расея | 29 (10.0%) |
| ЗША | 39 (13.4%) |
| Германія | 11 (3.8%) |
| Украіна | 77 (26.5%) |
| Літва, Латвія | 47 (16.2%) |
| Польшча | 80 (27.5%) |
| Кітай | 8 (2.7%) |

Усяго прагаласавала ад 19 да 22 жніўня 291

## ЗА БЕЛАРУСЬ!

## Каму вераць больш — міліцыі ці КДБ?

На сайце Галоўнага ўпраўленьня ўнутраных справаў Менскага гарвыканкаму праводзілася апытаньне: каму Вы давяраеце ў большай ступені?

Па стане на 17:00 20 жніўня вынікі былі наступныя (у адсотках):

Давяраюць:

міліцыі 9,

КДБ 8,

пракуратуры 3,

суду 2.

Нікому ня вераць 78

У гэты момант рэдактары сайту схамянуліся і выдалілі апытаньне.

**АГ**

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная.

Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз тэл.:
(017) 284–73–29,
(029) 260–78–32,
(029) 618–54–84.

## Купала ў кожны дом




**Выйшаў першы плякат з сэрыі «Нацыянальныя героі Беларусі». Каб набыць, пытайцеся праз тэл. (029) 505-39-11 або праз e-mail: plakat@biz.by**

# Дзяржава прадала VELCOM

Гешэфт адбыўся ў атмасфэры поўнай сакрэтнасьці. Продаж дзяржавай гэткага ліквіднага актыву можа быць зьвязаны зь неабходнасьцю аплачваць газавыя запазычанасьці.




PHOTO.BYMEDIA.NET

**Хто б ні валодаў «Вэлкамам», рэклямная кампанія працягваецца.**

Першым аб продажы дзяржаўнай долі першага апэратара GSM паведаміў сайт Bybanner.com з спасылкай на «крыніцы, якія заслугоўваюць даверу». У другой палове дня вестку пацьвердзіла блізкае да лукашэнкаўцаў агенцтва «Інтэрфакс».

У прыватнасьці, стала вядома, што кіпрская кампанія «SB-Telecom» (сузаснавальнік СП ААТ «МЛС», таварны знак Velcom) выкупіла пакет акцый, якія належаць дзяржаве.

24 траўня 2007 году Аляксандар Лукашэнка сустракаўся з старшынём кампаніі «SB-Telecom» Ідам Самаві (насамрэч кіпрская кампанія належыць арабам). На сустрэчы абмяркоўваліся пытаньні ўдзелу кіпрскай кампаніі ў будаўніцтве першаклясавай гасьцініцы ў Менску. Ідам Самаві выказаў зацікаўленасьць інвэставаньнем у рэканструкцыю й пераўзбраеньне беларускіх цэмэнтавых заводаў.

Раней, 12 красавіка на прэсавай канфэрэнцыі для кіраўнікоў беларускіх СМІ Лукашэнка заявіў пра тое, што думае над прапановай прадаць долю дзяржавы ў Velcom. Тады сама кіраўнік дзяржавы паведаміў, што за пакет акцый Velcom было прапанавана 300—400 мільёнаў даляраў. А пасьля дадаў: «Ну, калі пагандлюемся, то, можа, за 500 мільёнаў даляраў».

Паводле ацэнак экспэртаў, кошт кантрольнага пакету акцый Velcom'у 500 мільёнаў даляраў даволі прымальны.

Паводле слоў Лукашэнкі, дзяржава як трымальнік 51% акцый атрымлівае 17 мільёнаў даляраў дывідэндаў у год: «Таму я таксама думаю — чаму б не прадаць гэты пакет акцый? Так, камусьці будзе выгадна, але нам — супэрвыгадна! Тут ёсьць над чым падумаць…»

У самой кампаніі цэлы аўторак ухіляліся ад камэнтароў. У дзяржструктурах, што мелі сваю долю ў статутным фондзе «МЛС», адсылалі па камэнтары да самой кампаніі.

Пацьвердзіць інфармацыю пра продаж дзяржадолі акцыяў у СП ААТ «МЛС» аказалася няпроста. Па нумары тэлефону, пазначаным на сайце Міністэрства сувязі і інфарматызацыі ў якасьці прыёмнай кампаніі Velcom, слухаўку зьняў строгі мужчына: «Пост нумар адзін, слухаю вас!». Па атрыманым праз даведку тэлефоне дзяжурная апэратарка кампаніі спачатку прапанавала нумар тэлефону гендырэктара, але перапытаўшы пра нагоду для звароту да начальства, назвала электронны адрас для кантактаў з прэсай. «Такія пытаньні камэнтуюцца толькі праз электронную пошту», — катэгарычна адмовілася даваць нумар тэлефону супрацоўніца. Пазьней прыйшоў адказ, у якім прадстаўнік «МЛС» адмовіўся ад афіцыйных камэнтароў.

На сайце кампаніі, які з раніцы не грузіўся, апошняя навіна датаваная 20 жніўня і прысьвечаная пятым угодкам дзейнасьці Velcom у Віцебску.

У Міністэрстве сувязі, спаслаўшыся на тое, што адказны за кантакты з прэсай чыноўнік у адпачынку, падзею пракамэнтаваць адмовіліся, ды параілі зьвярнуцца наўпрост у Velcom.

У аддзеле кантактаў са СМІ РУП «Белтэлекам» таксама пакуль не валодаюць афіцыйнай інфармацыяй наконт продажу дзяржаўнай часткі акцыяў. Аднак там паведамілі, што цяпер рыхтуецца адпаведнае рашэньне і ў хуткім часе павінен зьявіцца прэсрэліз.

На думку экспэртаў, продаж дзяржавай гэткага ліквіднага актыву можа быць зьвязаны зь неабходнасьцю аплачваць газавыя запазычанасьці. Цана, за якую прададзены адзін з самых прыбытковых нацыянальных актываў, пакуль не паведамляецца.

**Сямён Печанко**

### СП ААТ «МЛС»

(гандлёвыя маркі : Velcom і Privet) — першы беларускі апэратар стандарту GSM, які працуе на рынку з 16 красавіка 1999. Да моманту ўгоды долі ўласнасьці ў СП разьмеркаваныя так:

- SB Telecom Ltd. — 49%,
- ЗАТ «Белтэхэкспарт» — 20%,
- Рэспубліка Беларусь (у апэратыўным кіраваньні Мінсувязі) — 30,9%,
- РУП «Белтэлекам» — 0,1%.

Долі ў кіраваньні й разьмеркаваньні прыбытку крыху іншыя:

- SB Telecom Ltd. — 49%,
- ЗАТ «Белтэхэкспарт» — 20%,
- РУП «Белтэлекам» — 31%.



# Юшчанка: «Куды падзелася беларуская мова?»

Прэзыдэнт Украіны Віктар Юшчанка выказаўся супраць наданьня расейскай мове статусу другой дзяржаўнай у краіне, што прапануе Партыя рэгіёнаў.

У якасьці кепскага прыкладу наступстваў падобных рашэньняў Юшчанка прывёў лёс беларускай мовы:

«Спэкуляцыі на тэмы мовы — гэта таксама праца супраць Украіны. Мне сёньня хочацца спытаць: куды падзелася ірляндзкая мова? Куды падзелася беларуская мова? Куды падзеліся дзясяткі моваў, дзяржавы якіх пайшлі па той формуле, якую нам сёньня сёйтой навязвае. Я перакананы, што гэта не палітыка Украіны, а спэкуляцыі, на якіх хтосьці яшчэ можа зарабляць палітычныя дывідэнды. Я выступаю супраць гэтага».

# Запатрабаваў дэклярацыю па-беларуску — чакай суду

30 жніўня ў Гомелі адбудзецца суд над Сяргеем Сямёнавым. Падставай для судовага разьбіральніцтва зьяляецца быццам бы адмова спадара Сямёнава ў запаўненьні мытнай дэклярацыі на расейскай мове.

Днямі Сяргей Сямёнаў перасякаў беларуска-ўкраінскую мяжу. У памежным пункце «Церуха» мытнікі запатрабавалі ў маладзёна запоўніць дэклярацыю. Актывіст адказаў на гэта, што гатовы прадставіць неабходную інфармацыю ў вуснай форме. Вынікам непрацяглай размовы з мытнікамі сталася складаньне пратаколу «пра непадпарадкаваньне законным патрабаваньням супрацоўніка мытні».

С.Сямёнаў запрашае беларусаў Гомеля падтрымаць яго падчас судовага працэсу, які адбудзецца 30 жніўня ў 14.30 па адрасе Пушкіна, 10.

**Загартаваны**

# Неафіцыйны рэфэрэндум дае аптымістычныя паказьнікі

Аднак на беларускай мове па-ранейшаму навучаецца толькі кожны пяты.

На беларускай мове ў Беларусі навучаюцца 21,5% школьнікаў. Пра гэта паведаміў старшыня грамадзкага аб'яднаньня «Таварыства беларускай школы» (ТБШ) Алесь Лозка.

Калі ў 1993/1994 навучальным годзе на беларускай мове навучаліся 76% першаклясьнікаў, то ў мінулым — толькі 18,6%. Адпаведныя паказьнікі ў Мінскай вобласьці — 92,6% і 31,9%, у Менску — 58,6% і 2,2%.

Вёска, кажа А.Лозка, пачынае русіфікавацца, бо закрываюцца малакамплектныя беларускамоўныя школы і дзяцей пераводзяць у больш буйныя, навучаньне ў якіх вядзецца на расейскай мове.

Найгоршая сытуацыя зь беларускамоўнымі школамі — у Гомельскай вобласьці, найлепшая — у Менскай.

Затое аптымістычныя паказьнікі дае, як сказаў А.Лозка, «неафіцыйны рэферэндум». Усё большая колькасьць абітурыентаў хоча здаваць тэсты па беларускай мове. У гэтым годзе іх было 87 тыс., пры тым, што толькі 20 тыс. скончылі школы зь беларускай мовай навучаньня. У 2006 годзе тэсты па беларускай мове абралі толькі 75 тыс. абітурыентаў ВНУ.

**Настасься Янушэўская, БелаПАН**




**Колькасьць абітурыентаў, якія здаюць тэсты па-беларуску, большае. У 2007 іх было 87 тыс., пры тым, што толькі 20 тыс. скончалі школы зь беларускай мовай навучаньня. У 2006 тэсты па-беларуску абралі 75 тыс. абітурыентаў ВНУ.**

PHOTO.BYMEDIA.NET

# «Маладому фронту» адмоўлена ў рэгістрацыі

Такое рашэньне вынес 17 жніўня Менскі гарадзкі суд.

Гарадзкі суд Менску разглядаў пазоў актывістаў незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт» да ўпраўленьня юстыцыі Менгарвыканкаму. Сталічныя ўлады ўжо некалькі разоў адмаўляліся рэгістраваць менскую гарадзкую арганізацыю «Маладога фронту». Апошняя адмова была падпісаная 5 ліпеня.

Інтарэсы «Маладога фронту» ў судзе прадстаўляла Настасься Лойка, упраўленьне юстыцыі — Натальля Янушкевіч. Судзьдзя — Зоя Салаўёва.

Ужо ў самым пачатку Наста Лойка зьвярнулася да суду з хадайніцтвам, каб справа была адкладзеная на 26 жніўня з прычыны таго, што на суд не зьявіліся некаторыя ўдзельнікі працэсу. Аднак судзьдзя адхіліла хадайніцтва, бо палічыла, што Лойка можа адна прадстаўляць «Малады фронт» на судзе.

Паводле спн.Янушкевіч «Маладому фронту» было адмоўлена ў рэгістрацыі з прычыны таго, «што арганізацыя заклікае да гвалтоўнай зьмены ўлады ў краіне, прапаганды вайны, міжнацыянальнай і расавай варожасьці». Калі Юры Чавусаў запытаўся, якую менавіта норму гэтага закону парушае «Малады фронт», то адказ быў наступны: «Усе».

Прадстаўніца ўпраўленьня юстыцыі Менгарвыканкаму лічыць, што заяўленыя мэты арганізацыі не адпавядаюць мэтадам, заяўленым у статуце. Натальля Янушкевіч кажа, што найхутчэй «Малады фронт» і надалей будзе працягваць дзейнасьць па арганізацыі несанкцыянаваных мітынгаў і пікетаў. Сваю ўпэўненасьць у гэтым яна абгрунтавала тым, што старшыня менскай арганізацыі «МФ» Зьміцер Хведарук неаднакроць прыцягваўся да адміністратыўнай адказнасьці. «І як гэта стасуецца з хрысьціянскімі каштоўнасьцямі, якія запісаныя ў вашым статуце?» — пыталася судзьдзя Салаўёва.

У судзе абвесьцілі перапынак да 16:00, але рашэньне абвесьцілі пасьля 18-й.

Маладафронтаўцы зьбіраюцца падаваць скаргу ў Вярхоўны суд.

**Зьміцер Панкавец**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Анархію ў інтэрнэце пачнуць спыняць увосень

Праект Закону «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі» ўключаны ў парадак дня восеньскай сэсіі ніжняй палаты «парляменту». Кіраўнік працоўнай групы па распрацоўцы закону дэпутатка Таццяна Сафроненка **(на фота)** паведаміла, што ў часе працы ўзьніклі спрэчкі.

«Вельмі цяжка прапісаць абмежавальны крытэр, які забясьпечыў бы, з аднаго боку, права на прыватнасьць, а з другога — права людзей на інфармацыю», — сказала Т.Сафроненка.



Распрацоўнікі адмовіліся ад абавязковай дзяржрэгістрацыі агульнадаступных інфармацыйных сыстэмаў. Цяпер сябры працоўнай групы дыскутуюць наконт мэтазгоднасьці абавязковай ідэнтыфікацыі карыстальнікаў інфармацыйных сыстэмаў.

**Тэлеграф.by**

## «Народную волю» на тры дні пакінулі без манітораў

З «Народнай волі» ў пятніцу, 10 жніўня, судовыя выканаўцы забралі маніторы да кампутараў і іншую аргтэхніку. Як патлумачыў прысутным судовы выканаўца, тэхніка вымаецца па прычыне невыкананьня рэдакцыяй судовага рашэньня.

13 жніўня, пасьля перамоваў галоўнага рэдактара ў судзе Ленінскага раёну і выплаты штрафу тэхніку вярнулі.

Пры канцы мінулага году паводле рашэньня суду рэдакцыя «Народнай волі» і яе аўтар мусілі заплаціць 2 млн рублёў гендырэктару ТАА «Эканоміка і права» Аляксандру Каўтуненку. Прычынай скаргі А.Каўтуненкі на «Народную волю» стаў артыкул пад назвай «Бутово минского пошиба».

У артыкуле, на які пакрыўдзіўся бізнэсовец, апавядалася, як Вольга Адамовіч засталася без жытла пасьля таго, як зруйнавалі яе прыватны дом у цэнтры гораду для будоўлі элітнай шматпавярхоўкі. Кіраўніком фірмы-забудоўшчыка быў А.Каўтуненка.

Першапачаткова пазоўнік прад'явіў газэце 14 абвінавачаньняў і патрабаваў па 100 мільёнаў рублёў з рэдакцыі і аўтара. У выніку суд задаволіў толькі адно абвінавачаньне і зьменшыў памер сумы да 1,5 мільёна рублёў з рэдакцыі і 500 тысячаў з аўтара артыкулу.


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Галоўны рэдактар «НВ» Іосіф Сярэдзіч.**

**Прэс-служба ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»**

# Міліцыя зьбіла Насту Палажанку

Штомесячная акцыя салідарнасьці ў Менску 16 жніўня скончылася зьбіцьцём яе ўдзельнікаў.

Першая група людзей прыйшла да касьцёлу Сьвятога Язэпа а 19:00, яна была нешматлікай — каля 15 чалавек. Яны далучыліся да верніц, якія штодня стаяць пад сьценамі бажніцы. Людзі прачыталі «Магутны Божа», пасьля чаго разышліся. За ўсім гэтым пільна назіралі прадстаўнікі спэцслужбаў. Яны ператрасалі заплечнікі прысутных. Паўла Севярынца міліцыянты пільнавалі аж да дому, але не затрымалі.

Праз гадзіну частка людзей зноў падышла да касьцёлу. Колькасьць удзельнікаў узрасла — было недзе 40 чалавек, стала болей і міліцыі. Людзі прачыталі малітву «Ойча наш...». Пасьля нехта зь міліцыянтаў выгукнуў: «Выпихивай это быдло». Людзей скіравалі ўбок Сьвіслачы і адпусьцілі.


АРСЕНЬ ПАХОМАЎ

Акцыя 16 жніўня. Наста Палажанка (зьлева).

Аднак і гэта быў не апошні падыход. Яшчэ праз некалькі хвілінаў людзі зноў прыйшлі да храму, іх было чалавек 50. Яны прынесьлі з сабой партрэты Дашкевіча, Казуліна. Міліцыянты скамандавалі, каб прысутныя разыходзіліся, але гэта не падзейнічала. Пасьля гэтага АМАПаўцы пачалі брацьу кола людзей, якія селі на ганак касьцёлу.

Насту Палажанку ўдарылі нагой па сьпіне, дасталося і іншым. Быў выпадак, што адзін АМАПавец зьбіваў хлопца, калі другі яго трымаў.

Людзей пачалі выштурхоўваць убок вуліцы Багдановіча.

У гэты час на прыпынак падыходзіў тралейбус №46, у яго і селі ўсе ўдзельнікі акцыі. Таксама ў тралейбус села шмат міліцыянтаў, якія стаялі ля дзьвярэй і нікога не выпускалі.

Побач з Чарнобыльскай капліцай тралейбус спыніўся «з тэхнічных прычынаў». Да яго адразу пад’ехаў аўтазак. Моладзь думала, што туды будуць запіхваць іх, аднак у машыну селі самі АМАПаўцы. Пасьля гэтага ні ў кога ўжо не было жаданьня вяртацца ізноў да касьцёлу.

Пазьней каля кінатэатру «Масква» быў затрыманы (асобы ў штацкім зацягнулі яго ў чорны джып) удзельнік акцыі Мікіта Сасім. Пазьней яго асудзілі на 10 сутак. А Наста Цішкевіч, якая бараніла хлопца, трапіла ў больніцу: ад удару ў яе пачаўся запаленчы працэс у нырках.

**Зьміцер Панкавец**

# Маладафронтаўцаў будуць бараніць сілай слова

16 жніўня пад старшынством Аляксандра Мілінкевіча прайшло паседжаньне камітэту ў абарону актывістаў незарэгістраванага «Маладога Фронту», прысьвечанае судам над Іванам Шылам, Яраславам Грышчэнем і Настасьсяй Азаркай, якія маюць адбыцца ў верасьні.

Бацькі 16-гадовага Івана, прысутныя на паседжаньні, настроеныя пэсымістычна. Уладзімер Шыла сказаў: «Мы адчуваем моцную падтрымку, але нічым супрацьстаяць ня можам».

Павал Севярынец адзначыў, што выпадак І.Шылы — ужо другі прыклад таго, калі судзьдзі адмаўляюцца судзіць юнакоў паводле арт.193: «Гэта можа паставіць пад пытаньне выкарыстаньне такога артыкулу Крымінальнага кодэксу».

Праваабаронца Людміла Гразнова зьвярнулася да людзей старэйшых з заклікам пісаць лісты ня толькі ў суды й КДБ, але і бацькам юнакоў: «Часта бывае так, што сямейныя стасункі, калі старэйшыя не разумеюць важнасьць справы маладых, зьяўляюцца значна большым выпрабаваньнем для людзей, чым суд».

**Барыс Гарэцкі**

## СЬЦІСЛА

### Масавае затрыманьне у Берасьці

Затрыманыя некалькі дзясяткаў чалавек на прэзэнтацыі кнігі Паўла Севярынца «Лісты зь лесу». У памяшканьне, дзе праходзіла імпрэза, уварваліся міліцыянты, спасылаючыся на тое, што, паводле інфармацыі, гэта адбываецца сход вядомай бандыцкай групоўкі. Прысутных загрузілі ў козьлікі й даставілі ў Савецкі РУУС Берасьця. Сустрэча адбывалася ў памяшканьні берасьцейскай управы Партыі БНФ і была ўзгодненая з кіраўніцтвам арганізацыі.

Паўла Севярынца, які таксама ўдзельнічаў у прэзэнтацыі, пакінулі ў ізалятары да серады, а ў сераду асудзілі на 15 сутак.

**Барыс Гарэцкі**

### Стыхійны бунт у Ждановічах

Сотня прадпрымальнікаў зладзілі стыхійны мітынг на рынку ў Ждановічах. 19 жніўня падатковыя органы праводзілі на рынку рэйдавую праверку. Адзін з прадаўцоў, што гандлюе футрамі, ня змог прад’явіць падаткавікам адзін з дакумэнтаў. Ён ня меў дазволу ад імя ўладальніка тавару на рэалізацыю тавару прадаўцом. Кантралёры заявілі, што ў сувязі з гэтым увесь тавар, які знаходзіцца ў краме, — на 100 тысячаў даляраў, будзе канфіскаваны. Гэта выклікала бурны пратэст гандляроў.

**МБ**

# «Беларуская калійная кампанія» заяўляе пра вялікі посьпех

Выгадная кан'юнктура на сусьветным рынку выводзіць Беларускую калійную кампанію ў лідэры паводле папаўненьня бюджэту валютай.

Дзякуючы выгаднай каньюктуры на сусьветным калійным рынку «Беларуськалій» можа атрымаць у гэтым годзе прыбытак ад экспарту ў памеры $140—200 млн, у інтэрвію газэце «Белорусы и рынок» паведаміў гендырэктар Беларускай калійнай кампаніі Ўладзімер Нікалаенка. Паводле ягоных словаў, заўважны рост прыбыткаў магчымы ня толькі дзякуючы спрыяльным коштам, але й праз само ўтварэньне БКК і адхіленьне пасярэднікаў.

Цікавасьць да супрацоўніцтва зь Беларусяй у сфэры вытворчасьці калійных угнаеньняў выяўляе Індыя. Яна імпартуе штогод 4 млн т. угнаеньняў, зь Беларусі ў тым ліку 1,2 млн т. І плянуе падвоіць аб'ём імпарту.

Пасол Індыі ў Беларусі Раджэндра Кумар Цьягі заявіў пра гатовасьць яго краіны інвэставаць пабудову ў нашай краіне пяці новых шахтаў на $12 млрд. Экспэрты, аднак, папярэджваюць, што ў выпадку задзейнічаньня такой колькасьці новых шахтаў, можа ўзьнікнуць праблема перавытворчасьці і адпаведна непазьбежнага падзеньня коштаў.

**Сямён Печанко**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Беларуская калійная кампанія**

ўтвораная ў сьнежні 2005 г. У яе склад на парытэтных умовах уваходзяць РУП ВА «Беларуськалій» і ААТ «Уралкалій». Аб'ём вытворчасьці складае 8,15 млн т. У плянах павелічэньне аб'ёмаў да 2012 г. да 9,65 млн. т.

Кампанія займае 30% сусьветнага рынку паставак калійных угнаеньняў. Мае 5 прадстаўніцтваў: у Пэкіне, Нью-Дэлі, Сан-Паўлу, Чыкага, Сынгапуры. Эўрапейскі рынак забясьпечваецца зь Менску, дзе месьціцца штаб-кватэра БКК. Прадукцыя кампаніі грузіцца ў партах Клайпэды (Літва), Вэнтсьпілс (Латвія), Мікалаеў (Украіна).

## Рубель працягвае таньнець

Курс нацыянальнай валюты да эўра і расейскага рубля ўзрос на 2 і 1 % адпаведна.

На мінулым тыдні на Беларускай валютна-фондавай біржы попыт на даляры ЗША складаў $141,5 млн супраць $86,4 млн прапановы. У мінулым годзе ў аналягічны пэрыяд розьніца паміж попытам і прапановай была неістотная. Магчыма, гэта зьвязана з пагаршэньнем сытуацыі ў замежным гандлі ў жніўні.

Адначасова назіраецца рост курсу беларускага рубля ў адносінах да эўра і расейскага рубля — 2 і 1% адпаведна.

**СП**

## СЬЦІСЛА

### Міністар прамысловасьці хоча перасесьці на «Саманд»

Паводле словаў Анатоля Русецкага, Samand хутка выцесьніць патрыманыя аўто зь беларускіх дарогаў. Іранскае тэлебачаньне са спасылкай на кіраўніцтва кампаніі Iran Khodro Co паведаміла, што міністар прамысловасьці Беларусі Анатоль Русецкі запэўніў прадстаўнікоў кампаніі ў вялікай цікавасьці беларусаў да іранскіх аўто. Айчынныя аўтамабілебудаўнікі


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Міністар Анатоль Русецкі за рулём «Саманду».**

хочуць выпускаць 50 тыс. легкавікоў, 20 тыс. зь якіх павінныя складаць Samand. Іншыя легкавікі маюць быць кітайскімі. Прычым да 2010 г. усё электроннае начыньне ў легкавіках будзе выпускацца ў Беларусі, падкрэсьліў міністар прамысловасьці.

### Італія дае крэдыт Беларусі

Беларусь атрымае ад Італіі крэдыт у суме 210 млн эўра. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністар Сяргей Сідорскі на сустрэчы з паслом Італіі ў Беларусі Гульельма Ардыцонэ. С.Сідорскі нагадаў, што Беларусь ужо карыстаецца крэдытам італьянскага банку «УніКрэдыта» ў аб'ёме 70 млн эўра.

С.Сідорскі таксама падзякаваў за тое, што Італія прымае «ўзважаныя палітычныя рашэньні па Беларусі на міжнароднай арэне». Маецца на ўвазе, мусіць, супраціў Італіі скасаваньню гандлёвых прэфэрэнцыяў ЭС па Беларусі.

### Сідорскі: Насельніцтва павінна цалкам аплачваць паслугі ЖКГ

Пра гэта заявіў Сяргей Сідорскі на нарадзе ў Лідзе.

**СП; БелТА**

# Адны супрацоўнікі «Штазі» ў «Газпром-Германія»

Высокі прадстаўнік «Gazprom Germania» — нямецкай даччынай кампаніі расейскага энэргаканцэрну — быў супрацоўнікам «Штазі». Пра гэта паведамляе газэта «Die Welt». Гэта ня першы выпадак сувязі мэнэджэраў «Газпрому» з даўнімі службамі бясьпекі ГДР.

Кіраўнік кадравай службы «Gazprom Germania» Ганс-Увэ Крэер быў неафіцыйным супрацоўнікам таемнай паліцыі ГДР пры канцы 70-х (вядомы, як агент «Ролянд Шродэр»), а таксама ў другой палове 80-х — гэтым разам пад псэўданімам «Гартман».

Крэер быў каштоўным супрацоўнікам «Штазі», бо меў доступ да ўсёй энэргагаспадаркі Цюрынгіі.

Раней выявілася, што гэдээраўскімі шпіёнамі былі фінансавы дырэктар «Gazprom Germania» і адміністрацыйны дырэктар кампаніі «Nord Stream», якая будуе Паўночны газапровод.

Былы канцлер Герхард Шродэр, які ўзначальвае сход акцыянэраў «Nord Stream», адмовіўся камэнтаваць мінулае свайго супрацоўніка.

**Вольга Данішэвіч**

# Расея забараняе трансьляцыю Бі-Бі-Сі

Уладальнікі маскоўскай FM-радыёстанцыі «Большое радио» спыняюць трансьляцыю праграмаў Бі-Бі-Сі. Адпаведнае паведамленьне было накіраванае на адрас Сусьветнай службы Бі-Бі-Сі кіраўніцтвам фінансавай групы «Фінам», якая зьяўляецца ўладальнікам радыё.

Такое рашэньне было прынятае ў сувязі з тым, што расейскія ліцэнзійныя органы патрабавалі ад фінансавай групы або зьняць праграмы Бі-Бі-Сі, або вяшчаньне станцыі было б спыненае.

**АГ**






# Мэркель — найпапулярнейшая канцлерка ў гісторыі

Папулярнасьць Ангелы Мэркель сярод немцаў расьце. Больш чым тры чвэрці немцаў выступаюць за тое, каб Мэркель засталася на чале краіны яшчэ на адзін тэрмін. Толькі 20% супраць гэтага.

Такія вынікі дало апытаньне грамадзкай думкі, праведзенае сацыялягічнай службай Emnid на замову газэты «Bild am Sonntag».

Ніколі яшчэ ў гісторыі Нямеччыны на палове тэрміну свайго ўрадаваньня ніводзін нямецкі канцлер ня цешыўся такой высокай папулярнасьцю. Немцам падабаецца і ўзважаны, далёкі ад папулізму палітычны стыль Мэркель, і яе дасягненьні ў якасьці старшыні Эўрасаюзу, і вынікі саміту вялікай восемкі, які прымала Нямеччына.

Урад жа ў цэлым далёка не такі папулярны, як яго кіраўніца.

**МБ**

# Sueddeutsche Zeitung: Горадня была цудоўным горадам

«З заходнебеларускага гораду, што на мяжы Польшчы, Літвы і Беларусі, мог бы атрымацца дзіўны палімпсэст з дамоў, цэркваў, палацаў, пабудаваных у часы Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, расейскага царызму. У будучыні гэты ўнікальны горад рызыкуе папоўніць вялікі сьпіс вельмі кепска адрэстаўраваных беларускіх архітэктурных помнікаў. Прыкладна 70 будынкаў зьнесеныя дзеля пашырэньня вуліцаў і стварэньня ўмоваў для прыбытковых новабудоўляў. Збольшага гэта робіцца ўладамі цішком», — гаворыцца ў артыкуле нямецкае газэты Sueddeutsche Zeitung.

«Рэальныя вынікі — гэта праўдзівы жах. Нейкія гратэскавыя фасады, будыніны, мала адпаведныя сваім гістарычным арыгіналам. Брук плошчаў пакрываецца таннай пліткай, і на іх ўсталёўваюцца гэтак званыя рэтраліхтары».

«Дылетанцкая халтура ў стылі савецкіх традыцыяў — не адзінкавы выпадак для Беларусі. Падобнае можна назіраць і ў старых кварталах Менску, Нясьвіжу, Наваградка. Як вынікае з матэрыялаў Міжнароднай рады па ахове помнікаў і гістарычных месцаў (Icomos) «за апошнія дзесяць гадоў Беларусь страціла 100 археалягічных аб'ектаў. Неўзабаве можна будзе сказаць: «Горадня была цудоўным горадам», — піша Sueddeutsche Zeitung.

**Milinkevich.org**

**Эўрапарлямэнт — за Горадню**

**У сувязі з разбурэньнем гістарычнай часткі Горадні Камітэт па культуры і адукацыі Эўрапарлямэнту зьвярнуўся ў ЮНЭСКА з просьбай абароны гістарычнай часткі цэнтру каралеўскага гораду над Нёманам. У заяве ўтрымліваецца просьба ўтварэньня міжнароднай камісіі, якая занялася б наглядам за рэстаўрацыйнымі працамі.**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# У Карэлічах затрымалі меркаванага забойцу школьніцы

17-гадовую жыхарку Карэлічаў (Гарадзеншчына), шукалі ад 3 жніўня. У забойстве дзяўчыны падазраецца 27-гадовы тройчы асуджаны жыхар гарадзкога пасёлку.

Калі дзяўчына не вярнулася дамоў увечары (а раней зь ёй такога не здаралася), маці патэлефанавала ў міліцыю. Па трывозе ўзьнялі асабісты склад Карэліцкага РУУС, выклікалі экспэртаў з Горадні, паведамляе «Міліцэйскі весьнік». Пошукі не давалі плёну больш за тыдзень. Сьледчыя выклікалі на допыты ўсіх падазроных асобаў. Найперш цікавіліся тымі, хто раней адбыў тэрмін за згвалтаваньне, бо працоўнай вэрсіяй зьнікненьня школьніцы было менавіта цяжкое злачынства сэксуальнага характару. Асаблівую цікавасьць выклікаў тройчы асуджаны мясцовы жыхар, які колькі месяцаў таму вызваліўся з турмы, дзе адбываў пакараньне за згвалтаваньне. Малады чалавек ня меў алібі на той вечар, а на наступны дзень нечакана для сваякоў зьехаў у Менск. Найбольшае падазрэньне выклікала тое, што неўзабаве пасьля зьнікненьня дзяўчыны ён, нібыта, набыў мабільны тэлефон акурат такі, як у зьніклай. Падвёў падазраванага і дэтэктар маны. У выніку малады чалавек пагадзіўся даць сьведчаньні і паказаў сьледчым месца, дзе схаваў цела дзяўчыны. Гэта адбылося на дзясяты дзень пошукаў. Сьледзтвам займаецца абласная пракуратура.

Здарэньне справакавала надзвычайны розгалас у невялікім гарадзкім пасёлку. Пакуль дзяўчыну шукалі, падзея абрастала самымі неверагоднымі вэрсіямі і чуткамі. Нібыта яе бачылі ў кампаніі незнаёмых маладых людзей, альбо ўвогуле пераапранутую, у парыку ў адной з крамаў пасёлку. А ўсё таму, што гэта ня першы выпадак забойства маладых дзяўчат у Карэлічах. Два гады таму маладая жыхарка пасёлку вярталася з Наваградку дамоў і села ў выпадковае аўто зь незнаёмымі маладымі людзьмі. Дзяўчына пагадзілася паехаць зь імі ў Менск пры ўмове, што яе адвязуць назад. У выніку нявысьветленых абставінаў адзін з новых знаёмцаў задушыў дзяўчыну й схаваў у двары аднаго зь менскіх мікрараёнаў.

**Сямён Печанко**

# Драма скончылася трагедыяй

У Бабруйску пасьля чатырох дзён пошукаў 10-гадовага хлопчыка знайшлі мёртвым.

У тую сераду ў Бабруйску зьнік 10-гадовы хлопчык. Пасьля сьледзтва быў затрыманы 14-гадовы вучань той жа школы, дзе вучыўся малы, а цела дзіцяці ў нядзелю знайшлі ў вадзе ля моста цераз Бярэзіну. На целе сьляды зьбіцьця.

Паводле папярэдняй вэрсіі, цераз дзень пасьля забойства падазраваны патэлефанаваў маці хлопчыка і запатрабаваў 3 тысячы даляраў выкупу. Як мяркуюць сьледчыя, васьмікласьнік дазнаўся, што сям’я зьніклага цяперака прадала хату.

Яўген Кавалёнак, начальнік упраўленьня крымінальнага вышуку УУС Магіёлўскага аблвыканкаму сказаў: «Мы хацелі знайсьці хлопчыка жывым. Яму ўсяго толькі 10 год. Таму выкарыстоўваліся ўсе магчымыя сродкі. Падлетак, які падазраецца ў зьдзяйсьненьні злачынства, цяпер затрыманы і знаходзіцца ў Бабруйскім ізалятары часовага ўтрыманьня. Ён стараецца ўнікнуць адказнасьці, і на кантакт са сьледзтвам ідзе вельмі цяжка. Так што нам будзе цяжка даказаць ягоную віну».

**Паводле СТВ і БелТА**

# У Чарнобыльскай зоне знайшлі невядома каго

Чалавек ня помніць, хто ён і адкуль, затое выдатна разьбіраецца ў тактыка-тэхнічных характарыстыках пісталета Макарава. Ён сядзеў на беразе Прыпяці ў Хойніцкім раёне. Гэты «нехта» ня ведае, як тут апынуўся і хто ён такі.

Знойдзены тыдзень таму мужчына фізычна здаровы. І добра арыентуецца ў рэальных падзеях. У прыватнасьці, ведае, у якой краіне апынуўся, імёны палітыкаў, арыентуецца ў геаграфіі і гісторыі.

Засталіся ў яго і пэўныя ўменьні зь мінулага: ён кіруе аўто і выдатна разьбіраецца ў ТТХ пісталета Макарава, паведаміла АНТ. Гаворыць з расейскім акцэнтам — мажліва, што з Расіі.

Апошнімі гадамі ў Расіі масава фіксуюцца аналягічныя выпадкі амнэзіі.

**Радыё «Рацыя»**


«СБ»
**Калі хто пазнаў гэтага чалавека, тэлефануйце ў Нараўлянскі РУУС: (02355) 213-95, (029) 651-42-32 ці 102.**

# 95 штрафаў за вечар тым, хто не засьвяціўся

За вечар панядзелка супрацоўнікі ДАІ аштрафавалі 95 чалавек за адсутнасьць сьвятлаварытальных элемэнтаў на вопратцы.

**Барыс Гарэцкі**

# Радзіма Буйніцкага пад пагрозай

Аграгарадок у Празароках зьнішчыць традыцыйную забудову мястэчка.

Культурную каштоўнасьць маюць ня толькі манумэнтальныя спаруды. Каштоўная і шараговая колісь забудова, што стагодзьдзямі фармавала непаўторнае аблічча нашых гарадоў і мястэчак. Гэтым разам пагроза навісла над старасьвецкай мястэчкавай забудоваю ў Празароках, дзе ўлада маніцца зьнішчыць рэшты даўніны на вуліцах Цэнтральнай і Полацкай. На тым месцы будзе пастаўлены тыпавы аграгарадок.

У цэнтры вёскі ўстаноўлены помнік заснавальніку беларускага прафесійнага тэатру Ігнату Буйніцкаму. Тут жа ён і пахаваны. А ў школе ўжо 25 гадоў існуе музэй, які расказвае пра жыцьцё і тэатральную дзейнасьць знакамітага земляка.

Вуліца Цэнтральная ідзе ў Палевачы, дзе нарадзіўся І.Буйніцкі. Буйніцкі ў сваім маёнтку ладзіў вечарыны танцораў, сьпевакоў, музыкаў. Так у 1907 годзе зь ягонай лёгкай рукі склаўся аматарскі калектыў першага беларускамоўнага тэатру. Дарэчы, ён утрымліваўся на даходы з маёнтку самога Буйніцкага. Аднак, займаючыся тэатрам, а не гаспадаркай, ён зьбяднеў так, што яму давялося прадаць свой маёнтак і купіць хату ў Празароках.

Тутсама на пачатку XX стагодзьдзя нарадзіліся Тамаш і Антон Падзявы, каталіцкія сьвятары, актыўныя ўдзельнікі нацыянальнага хрысьціянскага руху XX ст.

Са зьнішчэньнем рэштаў старое забудовы ўжо нішто ня будзе ў Празароках нагадваць пра вытокі нашае нацыянальнае сьвядомасьці. Жыхары Празарокаў Фелікс Лавейка і Вольга Гінько кажуць, што падобных будынкаў ужо было шмат зьнесена ў апошняе дзесяцігодзьдзе. Засталося іх вобмаль...

**Уладзімер Скрабатун, фота аўтара**



Панарама Празарокаў.



Забудова канца XIX ст. на вуліцы Цэнтральнай у Празароках.




Гэтаму будынку ўжо 77 гадоў.

# Першы чэмпіянат касцоў

Грамадзкае аб'яднаньне «Ахова птушак Бацькаўшчыны» пры падтрымцы сусьветнага экалягічнага фонду GEF зладзілі ў Зьдзітаве (Берасьцейшчына) першы ў Беларусі чэмпіянат касцоў.

«Ахова птушак Беларусі» прабівала ідэю правядзеньня мерапрыемства для таго, каб захаваць нізіннае балота ад зарастаньня хмызам. Бо толькі на адкрытых месцах гняздуе вяртлявая чаротаўка — птушка з атраду вераб'іных, якой пагражае зьнікненьне. І за зьберажэньне якой адказвае Беларусь — менавіта ў нас гняздуе 60% ад сусьветнай папуляцыі.

У Польшчы такія спаборніцтвы ладзяцца ўжо больш за дзесяцігодзьдзе.

Балота ў Зьдзітаве загадзя было падзеленае на дзялянкі.

«Хто б мог падумаць, — казалі жанчыны са Зьдзітава, — што нашае балота стане сапраўднай славутасьцю. Мы яго некалі пракліналі, калі даводзілася сена вывозіць на лодцы або ставіць у стажкі і чакаць марозу».

Ірына Быцкевіч, сакратарка сельсавету, сказала, што ўрочышча, дзе ладзяцца спаборніцтвы, перасталі касіць 17 гадоў таму. Належыць яно Спораўскаму заказьніку.

Касіць асаку з чаротам было няпроста.

У асабістым першынстве пераможцам стаў Пятро Вярышка з каманды Спораўскага заказьніка. У камандным заліку першае месца заваявала каманда СВК «Земляроб» Бярозаўскага раёну — гаспадары спаборніцтваў. Родныя сьцены дапамагаюць, у дадзеным выпадку — роднае балота.

**МБ; Сьвятлана Яскевіч, «Звязда»**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Пасьля Спасу адлятаюць буслы.**

## ААН ратуе беларускіх кажаноў

Група берасьцейскіх навукоўцаў перамагла ў конкурсе Праграмы малых грантаў Глябальнага экалягічнага фонду, які забясьпечвае ПРААН. Пагадненьне пра старт праекту «Захаваньне найбуйнейшай у Эўропе зімавальнай калёніі рукакрылых у заказьніку «Барбастэла» падпісалі прадстаўніца ААН у Беларусі спадарыня Джыхан Султаноглу ды старшыня Клейнікаўскага сельсавету Яўген Качан.

Кажаны захапілі старыя бастыёны Берасьцейскай фартэцы адразу, як адтуль сышлі людзі. Аднак аховы не было, і невядомыя вандалы два гады таму залезьлі ў памяшканьні, аблілі зьвяркоў саляркай ды падпалілі. Загінула 400 кажаноў… Навукоўцы й вырашылі паставіць на ўваходах у казэматы краты. Па розных ацэнках, ад лістапада да сакавіка тут бывае пад 3000 кажаноў. Як мясцовых, гэтак і «імігрантаў» з Расеі ды Польшчы. Пяць відаў жывёлаў занесена ў Чырвоную кнігу.

## Бульдозэры ледзь ня зьнішчылі гістарычны Ракаў

У Ракаве мясцовыя археолягі літаральна на хвіліны апярэдзілі рабочых, што клалі трубы ў гістарычным цэнтру мястэчка. Сярод знаходак — ганчарная печка XVI ст., 50 кг кафлі таго часу, кніга Торы на ідыш і выявы анёлаў.

## Нечуваны ўзьлёт БАТЭ

Упершыню ў гісторыі беларускі футбольны клюб трапіў у трэці кваліфікацыйны раўнд Лігі чэмпіёнаў. БАТЭ перамог кіпрскі «Апаэль» і ісьляндзкі «Хафнаф’ёрдзюр». Апошнім жа бар’ерам для барысаўцаў стаў бухарэсцкі клюб «Сьцяўа». Румынаў трэніруе легендарны футбаліст Георгі Хаджы, якога некалі называлі балканскім Марадонам.

Зь першых хвілінаў адчувалася, што румыны спраўнейшыя, аднак нярэдка ў футболе парадак б’е клясу. І на 40-й хвіліне абаронца БАТЭ Арцём Радзькоў скарыстаў адскок у штрафной «Сьцяўа» і адкрыў лік — 1:0.

У другой палове сустрэчы барысаўцы відавочна саступалі бухарэстцам у сьвежасьці. Ня дзіва, чэмпіянат краіны пераваліў за экватар, а румыны толькі выйшлі з адпачынку. Гэта хутка адлюстравалася на таблё. Цяпер ужо цэнтральны абаронца «Сьцяўа» Гаян удала сыграў галавой у штрафной БАТЭ — 1:1. А за шэсьць хвілінаў да фінальнага сьвістка бліскучы ўдар атрымаўся ў Дзіке — 1:2.

Румыны маглі забіць яшчэ, але не імкнуліся, за што і былі пакараныя. У дадатковы час лік выраўняў Генадзь Блізьнюк — 2:2. Пачуцьцё прыкрасьці зьмяніла надзея. Матч у адказ пройдзе праз два тыдні ў Бухарэсьце.

## Чорная паласа Мірнага

Першая ракетка Беларусі Макс Мірны вылецеў з сотні найлепшых тэнісістаў сьвету паводле рэйтынгу Асацыяцыі тэнісістаў. Ён займае 105-ю пазыцыю.

**Зьміцер Панкавец, Сяргей Будкін, Арцём Багданаў, радыё «Рацыя», Польскае радыё для замежжа**



SALIGORSK.ORG

### 14 жніўня

## Назад у Кастрычніцкі

Скарга **Юрася Алейніка**, адлічанага з чацьвёртага курсу Акадэміі кіраваньня пры прэзыдэнце, будзе разгледжаная 28 жніўня ў судзе Кастрычніцкага раёну Менску. Такое рашэньне прыняў судзьдзя Кастрычніцкага раёну падчас папярэдняй гутаркі з зацікаўленымі бакамі. Адвакат Ю.Алейніка **Ларыса Атаманчук** настойвае на адмене загаду аб адлічэньні.

## Бунтаўцамі цікавяцца

На допыты ў менскую гарадзкую пракуратуру выклікаюць сяброў незарэгістраванага руху **«Бунт»**. Праваабаронцы не выключаюць, што ў хуткім часе можа быць пачатая новая крымінальная справа. Паводле словаў выкліканых, сустрэчы ў пракуратуры ладзяць кадэбісты. У часе гутарак у сяброў руху цікавіліся арганізацыяй працы сайту і крыніцамі інфармацыі, што на ім разьмяшчаецца.

## На берасьцейскай мытні

Супрацоўнікі Берасьцейскай мытні канфіскавалі ў сакратара аргкамітэту па стварэньні партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя» (БХД) **Дзяніса Садоўскага** дыскі з інфармацыяй пра сталінскія рэпрэсіі і тэкстам твораў Васіля Быкава, а таксама інфармацыйныя матэрыялы кампаніі па абароне права на свабоду сумленьня.

## У Магілёве аблога

У Магілёве міліцыянты сарвалі сэмінар прадстаўнікоў няўрадавых арганізацыяў з удзелам замежных партнэраў, які ладзіўся на прыватнай кватэры. Грамадзяне Польшчы пасьля трох гадзінаў аблогі пагадзіліся прадставіць дакумэнты для праверкі.

### 16 жніўня

## У Полацку

У акцыі Салідарнасьці ўзялі ўдзел каля 15 чалавек. Столькі ж людзей прыйшлі маральна іх падтрымаць. Прысутныя нагадалі гараджанам імёны зьніклых у Беларусі палітыкаў і журналістаў. Ніхто ня быў затрыманы.

## У Жлобіне

У цэнтры гораду зьявіліся расьцяжкі «Свабоду Дашкевічу!» і «Рэпрэсіі нас ня спыняць».

## У Салігорску

Моладзь Выйшла на плошчу з партрэтамі Зьмітра Дашкевіча.

## У Магілёве

Актывісты распаўсюджвалі праваабарончыя бюлетэні і малявалі палітычныя графіці на асфальце.

## Моладзь падтрымала

Акцыю салідарнасьці з палітвязьнем правялі актывісты грамадзянскай кампаніі «Jeans за свабоду». Моладзь сабралася ля пад`езду дому, дзе жыве сям'я **Аляксандра Казуліна.**

### 17 жніўня

## Сасіму далі

Затрыманаму ў Дзень Салідарнасьці **Мікіту Сасіму** суд Цэнтральнага раёну Менску адмераў 10 сутак арышту за «дробнае хуліганства».

### 19 жніўня

## Роварная карыда зь бел-чырвона-белымі сьцягамі

Салігорскія актывісты 19 жніўня, выехалі на роварах з прымацаванымі да багажнікаў бел–чырвона–белымі сьцягамі у цэнтар Салігорску.

Велаакцыя пачалася ля будынку суду, дзе мае адбыцца працэс над мясцовым маладафронтаўцам Іванам Шылам.

Пасьля маладафронтаўцы пераехалі на цэнтральную плошчу і пасьпелі аб'ехаць яе зь дзясятак разоў перад тым, як прыехала міліцыя.

Удзельнікаў акцыі ўзялі ў кола й пачаліся затрыманьні, як піша Saligorsk.org, з пагонямі на аўтамабілях, перахопамі і бляканьнем цэлых раёнаў.

Затрымалі Віктара Гаргуна, у якога былі пры сабе вуды, паводле міліцыянтаў, менавіта тыя, да якіх чапляліся сьцягі, а таксама Івана Шылу. Апошняга, паводле Saligorsk.org, па дарозе ў пастарунак зьбілі: твар быў крыві, на целе некалькі крывападцёкаў. Івана Шылу абвінавацілі ў нецэнзурнай лаянцы й непадпарадкаваньні законным патрабаваньням міліцыі.

### 20 жніўня

## РНЕ пагражае Мірону

Чацьвёра актывістаў віцебскай гарадзкой арганізацыі КХП БНФ **Барыс Хамайда**, **Ян Дзяржаўцаў**, **Сяргей Каваленка** і **Ян Таўпыга** атрымалі лісты з пагрозамі ад незарэгістраванай арганізацыі РНЕ. Да кожнага з адрасатаў невядомыя зьвярнуліся як да «Мірона». Фашыстоўцы пагражаюць «Мірону» расправай у выпадку, калі над Віцебскам яшчэ раз зьявіцца бел–чырвона–белы сьцяг. У праваахоўныя органы зьвярнуўся толькі Ян Дзяржаўцаў. Лісты з пагрозамі ад РНЕ ў розны час летась атрымалі рэдакцыя незалежнай газэты **«Витебский курьер»**, старшыня гарадзкой арганізацыі АГП **Алена Залеская** і загадчыца літаратурнай часткай Коласаўскага тэатру **Вікторыя Дашкевіч**.

**СП**

# Стары спэктакль з новай бутафорыяй

У Казахстане партыя Назарбаева заняла ўсе месцы ў першым парлямэнце, выбраным паводле прапарцыйнай сыстэмы.



«Элегантную перамогу» атрымала прэзыдэнцкая партыя «Нур Атан» — 88% галасоў. Ніводная іншая партыя ня здолела перасягнуць 7-адсоткавы бар'ер. То бок апазыцыі ў іхнім мажылісе не дазволілі прысутнічаць нават сымбалічна.

Калі ў Беларусі некалькі месяцаў таму пачалі борзьдзенька ляпіць структуры «Белае Русі», палітызаваная публіка загаманіла, што і ў нас могуць зладзіць выбары паводле партыйных сьпісаў. Але гэта не падстава для эйфарыі. Казаскі прыклад яскрава сьведчыць: калі ўсё схоплена, псэўдадэмакратычная бутафорыя не перашкаджае захоўваць і нават умацоўваць аўтарытарызм. Назарбаеў пад маркай дэмакратычных рэформаў аформіў для сябе магчымасьць пажыцьцёвага прэзыдэнцтва.

Магчыма, сяго-таго ў Менску зайздрасьць бярэ. Астана спрытна пускае пыл у вочы Захаду. У прыватнасьці, з прыцэлам на старшынёўства ў АБСЭ. Дый факт тое, што Назарбаеў ня мае праблемаў зь візамі ў разьвітыя дэмакратыі.

Зь іншага боку, цэнтар Эўропы — гэта вам не Цэнтральная Азія. Беларускае грамадзтва, як ні трушчаць тут парасткі грамадзянскае супольнасьці, усё ж значна болей сасьпела для пераўтварэньняў. Хто ведае, мо' і гамэапатычныя дозы лібэралізацыі каталізуюць непажаданыя для уладаў працэсы? Бадай, менавіта таму кіроўныя вярхі баяцца хай сабе касмэтычна, дзеля блізіру, перарабляць выбарчае заканадаўства. І ўвогулеісьці на найменшыя саступкі што да дэмакратызацыі. Нават адпаведная лексыка, мусіць, лічыцца табуяванай, у той час як казахскі правадыр любіць паразважаць пра палітычныя рэформы да разьвіцьцё плюралізму.

Заўважце: у Менску палічылі за лепшае страціць прэфэрэнцыі Эўразьвязу, чым даць трохі волі прафсаюзам. Бо палохае прывід польскай «Салідарнасьці». І слухаць ня хочуць пра лібэралізацыю мэдыйнай палітыкі — наадварот, маюць намер закруціць шрубы ў інтэрнэце. Дый партыяў да наступных выбараў, пэўна, паменее. Так што калі і вырашаць пусьціць Эўропе пыл у вочы выбарамі «а-ля Назарбаеў», дык электарат у сьпісах не заблытаецца.

**Аляксандар Класкоўскі**

# Дубавец: «Людзям трэба тлумачыць, чаму тут пішам мяккі знак, а тут — «ня»

Чаму папяровая вэрсія тыднёвіка «Свабода» выходзіць афіцыйным правапісам, а інтэрнэт-вэрсія — «тарашкевіцай»? Адказвае адзін з аўтараў газэты **Сяргей Дубавец**.

«Выдаваць папяровую газэту «наркамаўкай» было вырашана ад першага нумару. Справа ў тым, што ў нашым праекце былі і ёсьць розныя людзі. Адны настойвалі, каб газэта выходзіла па-беларуску, іншыя — па-расейску, трэція выступалі за білінгвізм. Аднак газэты па-расейску няхай выдаюцца ў Расеі, а білінгвізм — гэта ўвогуле нейкая шызафрэнія, раскол сьвядомасьці. Мы пагадзіліся на кампрамісным варыянце — наркамаўцы. «Свабоду» ніхто ня можа выпісваць афіцыйна і сьвядома, часьцей за ўсё яна трапляе да людзей абсалютна выпадкова. На рынках ці ў іншых месцах. Тут мы бліжэй да «Мужыцкай праўды» Кастуся Каліноўскага. Гэта вымушаная сытуацыя, бо афіцыйна зарэгістраваць «Свабоду» немагчыма. І калі газэта трапляе ў рукі простаму чалавеку, не заангажаванаму ў нацыянальны рух і не інтэлектуалу, то ў яго ня мусіць узьнікаць лішніх пытаньняў: чаму тут мяккі знак, а тут «ня»? Чаму мы пішам ня так, як вучаць у школе? Каб гэта растлумачыць, трэба было б кожнаму прачытаць лекцыю пра мову і правапіс. Тым часам наша эксклюзіўная інфармацыя і аналітыка засталася б «за кадрам».

Выходзіць «наркамаўкай» у інтэрнэце я ня бачу ніякага сэнсу, хіба калі толькі нам прапануюць за гэта вялікія грошы. «Ад душы» гэтым правапісам ня пішуць. Людзям, якія карыстаюцца сусьветнай павуцінай, нічога тлумачыць ня трэба».


СВАБОДА
ГАРОТА
ХТО МОЖА БЫЦЬ ГАРАНТАМ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСІ?
УДАР! ШТАНГЕ!
СПОРТ І ПАЛІТЫКА
ВЫГНАННЕ Ў РАЙ

**Запісаў Зьміцер Панкавец**

# Палёт у благасфэру

Усеагульная інтэрнэтызацыя Беларусі — зусім не гарантыя духоўнага здароўя нацыі. Піша **Віталь Тарас.**

### Бяру свае словы назад

Зьяўленьне ў інтэрнэце відэароліка, на якім нейкія самазваныя расейскія нацысты адразаюць аднаму чалавеку галаў, а другому страляюць у патыліцу, выклікаў у некаторых расейскіх блогах радасьць (так ім і трэба, «панаехалі тут»!), у іншых — абурэньне. Не бяруся сказаць, каго й чаго больш.

Я бачыў толькі некалькі кадраў і чытаў апісаньне сюжэту. Але нават агульнае апісаньне павінна нармальнага чалавека прывесьці ў стан шоку. Нешта падобнае (напрыклад, кадры павешаньня Садама Хусэйна) зьяўлялася ў сеціве й раней. Але паводле ўзроўню садызму й нянавісьці такога, выглядае, яшчэ не было. І нават калі гэта не забойства, а «ўсяго толькі» інсцэніроўка з дапамогай мантажу, сам «твор» ня можна не шакаваць. Ня так важна, хто й дзеля чаго рашыўся выкласьці яго ў інтэрнэт, але важна, што яго маглі бачыць у інтэрнэце тысячы, сотні тысячаў карыстальнікаў. Блогеры й мадэратары форумаў не маглі ведаць, ці гэта інсцэніроўка, ці не. Але як у юрыспрудэнцыі ёсьць прэзумпцыя невінаватасьці, гэтак у інтэрнэт-супольнасьці павінна існаваць прэзумпцыя адваротнага кшталту: усё, што антыгуманна, што зьнішчае або прыніжае чалавечую годнасьць, павінна адразу выдаляцца.

Напрыклад, пэдафілія ва ўсім сьвеце, у тым ліку ў інтэрнэце, перасьледуецца паводле закону й жорстка караецца. А чаму ж дэманстрацыя сьмяротнага пакараньня (хай сабе «падробленага»), якое могуць бачыць,сярод іншых, дзеці, выклікае запаволеную рэакцыю грамадзтва? Наколькі я ведаю, відэаролік быў даступны ў сеціве цягам 18 гадзінаў запар. І размову я вяду тут не пра «сысадмінаў» і не пра праваахоўныя органы нават, а менавіта пра інтэрнэт-супольнасьць у цэлым.

Гэты сюжэт прымусіў мяне перагледзець сваё ранейшае стаўленьне да інтэрнэту. Я казаў пра тое, што сеціва ёсьць усяго толькі інструмэнтам, з дапамогай якога можна ствараць цуды, а можна рабіць пошлыя надпісы, як на плоце, альбо выкарыстоўваць яго ў якасьці пымыйнай ямы.

Цяпер я бяру свае словы назад. Як і многія мае калегі, я ня здолеў ацаніць у поўнай меры значэньне інтэрнэту.

### Інтэрнэт безь берагоў

Нябожчык Станіслаў Лем пісаў, што інтэрнэт — самая страшнае вынаходніцтва чалавецтва, страшнейшае нават за атамную бомбу. Бо наступствы яго ў будучым могуць пераўзысьці наступствы магчымага ядравага апакаліпсісу. Лем параўноўваў навукова-тэхнічны прагрэс з мыліцамі. Чалавек прызвычайваецца хадзіць выключна зь іх дапамогаю — прыбяры іх, і здарыцца катастрофа. Што тычыцца інтэрнэту, мне здавалася, што пісьменьнік-фантаст у чымсьці перабольшвае. Што кепскага ў тым, калі чалавек можа перапісвацца, не выходзячы з дому, зь дзясяткамі, сотнямі людзей на ўсёй плянэце? Што кепскага, калі можна выкласьці ў нэт ня толькі любую навіну, фатаграфію, але й адразу пракамэнтаваць прачытанае або ўбачанае? Што кепскага ў электронным подпісы, інтэрнэт-банкінгу й г.д.?

Абсалютна нічога. Калі не лічыць, што інтэрнэт са сродку камунікацыі паміж людзьмі ўсё больш ператвараецца ў зброю масавай маніпуляцыі.

Аналёгія з атамнай зброяй тут будзе дарэчы. Ня дай Бог, калі ядравая дубіна трапіць у рукі вар'ята-дыктатара, альбо тэрарыста. Чамусьці ніхто з кіраўнікоў вялікіх дзяржаваў (у тым ліку й Расеі) не сумняецца ў тым, што нельга, скажам, Паўночнай Карэі ці Ірану даваць магчымасьць займець уласную атамную бомбу. Іншая справа, што й запабегчы гэтаму становіцца ўсё цяжэй. Цягнік навукова-тэхнічнага прагрэсу даўно пайшоў і спыніць яго няма ніякай магчымасьці, як бы таго ні хацелася вялікім дзяржавам.

Гэтаксама і з інтэрнэтам. Ад самага пачатку толькі невялікая частка людзей карысталася ім як дапаможнікам у навуковай працы ці ў мэтах адукацыі, асьветы, журналістыкі. Сярод першых зьявіліся ў сеціве парнаграфічныя сайты і іх зона няўхільна расьце, як і зона азартных гульняў. Зьяўленьне блогаў адкрыла новую эпоху (і аўтар гэтых радкоў быў сярод першых, хто прасьпяваў ім асану). Але яны адкрылі новыя магчымасьці, у тым ліку, і для порнаіндустрыі, і для прапаганды гвалту.

У інтэрнэт праз жывыя журналы («дзёньнікі») і «камэнты», дзякуючы іх ананімнасьці, шырокім патокам паліліся агрэсія, невуцтва, ксэнафобія, культ нецярпімасьці да чужой думкі. Што ўжо казаць пра такую «бязьвінную» рэч як графаманія.

А калі гэты паток агрэсіўнай сьвядомасьці скіраваць у патрэбны ўладам бок…

### Каналізацыя агрэсіі

І хай мне ня кажуць, што гэта тычыцца толькі «рунэту» (расейскамоўнага інтэрнэту). Інтэрнэт таму й завецца глябальным сецівам, што ў яго сапраўды няма межаў. Вядома, што 80-85 % усіх сайтаў на плянэце зарэгістраваныя ў ЗША. Вядома таксама, што хоць сам панятак уэб-сайт (сёлета яму споўнілася 20 гадоў) зьявіўся ў эўрапейскім навукова-дасьледчыцкім цэнтры Цэрн у Швайцарыі, інтэрнэт набыў сёньняшняе аблічча і маштаб дзякуючы Злучаным Штатам.

Але гэта нічога не мяняе. Правайдэры не нясуць адказнасьці за зьмесьціва сайтаў ці блогаў. (Прынамсі, на Захадзе). Праўда, амэрыканскія спэцслужбы цяпер маюць права кантраляваць і выдаляць асобныя паведамленьні ў інтэрнэце ў выпадку тэрарыстычнай пагрозы, ці патрабаваць ад правайдэра раскрыць канфідэнцыйныю інфармацыю датычна карыстальнікаў.

Але што тычыцца саміх карыстальнікаў — нават самы лепшы мадэратар ня ў стане апанаваць станам агрэсіўнасьці, часам на мяжы гістэрыі, які выплёскваецца штодня, дапусьцім, у камэнтарах. Дастакова паглядзець хаця б на камэнтары на сайце «Нашай Нівы». Нават у

беларускамоўнай аўдыторыі, узровень культуры якой відавочна на парадак вышэй, чымся ў расейскамоўным сэктары белнэту, сустракаецца шмат абразьлівых, безапэляцыйных, правакацыйных водгукаў. Пра дзяжурных правакатараў-«брыгаднікаў» я тут не кажу. Тут, хутчэй, бяда, а не віна людзей, якім няма куды каналізаваць сваю фрустрацыю, незадаволенасьць уласным жыцьцём у сёньняшнім грамадзтве.

Уся справа — у ананімнасьці «пастоў», аўтары якіх упэўненыя ва ўласнай беспакаранасьці і сваім праве гаварыць усё, што ўздумаецца. Тут усё дазволена. Тое, што ў грамадзкім або нават прыватным жыцьці культурнага чалавека лічыцца табу (напрыклад, мат) лёгка можна сабе дазволіць у інэце. Сярод вялікай часткі супольнасьці гэта нават лічыцца добрым тонам.

Інэт дае магчымасьць выхаду ўсім, у тым ліку самым нізкім, жывёльным, інстынктам.

Як казаў Зыгмунд Фройд, культура складае самы верхні і самы тонкі слой сьвядомасьці чалавека. Дасткова яго зьняць — і людзі ператвараюцца ў небясьпечных жывёлінаў, кшталту тых выродкаў, што забіваюць «асобаў няруcкай нацыянальнасьці», альбо зьмяшчаюць кадры забойства (ці яго інсцэніроўкі) у сеціве.

## Прадажная дзеўка імпэрыялізму

Дык што, інтэрнэт ёсьць абсалютным злом? Як жа тады з гэтым злом змагацца? Можа быць, маюць рацыю тыя, хто, падобна Лукашэнку, заклікае навесьці парадак у інтэрнэце, ачысьціць яго ад «сьмецьця»? Можа, даўно насьпела пара прыняць закон, які забясьпечваў бы гэты парадак?

Пытаньне не такое простае, як можа падацца. Мы бачым, што ў той самай Расеі, дзе інтэрнэт ужо ў значнай ступені кантралюецца, дзе нават аўтара камэнтару (!) у блогу могуць прыцягнуць да судовай адказнасьці (чалавек ня надта добразычліва выказаўся пра міліцыю), пакуль не змаглі знайсьці аўтараў згаданага відэароліка з забойствам. Арыштавалі толькі аднаго з тых, хто яго выстаўляў у сеціве — ці то ён сам прыйшоў, ці яго злавілі…

Але характэрная рэакцыя грамадзтва, найперш — інтэрнэт-супольнасьці, пра якую я гаварыў на самым пачатку. Калі ня браць шчырых «фашыкаў», якія альбо адкрыта радаваліся, альбо (разумнейшыя зь іх) сьцвярджалі, што гэта правакацыя супраць расейскіх нацыстаў, асноўная маса «камэнтатараў» цікавілася тым, ці ня ёсьць гэта часткай піяр-кампаніі ўладаў у рамках падрыхтоўкі да выбараў? Ды яшчэ на тле паведамленьняў пра тэракт на чыгунцы Масква — Санкт-Пецярбург.

То бок, вялікі сэгмэнт расейскага грамадзтва ўжо звыкся з думкай, што з дапамогай інтэрнэту можна маніпуляваць яго настроямі — як дагэтуль гэта робіцца з дапамогаю тэлебачаньня. Так што ў інтэрнэце парадаксальным чынам спалучаюцца як бязьмежная, нібыта, свабода ад цэнзуры, гэтак і калясальныя магчымасьці маніпуляцыі грамадзкай думкай. І гэтыя магчымасьці палягаюць, зноў жа, у ананімнасьці. Падобныя тэхналёгіі ў інтэрнэце (успомнім ананімныя лісты «патрыётаў КДБ») выкарыстоўваліся падчас выбарчых кампаніяў і ў Беларусі.

Так што ва ўладаў РБ ёсьць альтэрнатыва: поўная цэнзурная блякада інтэрнэт-прасторы, як у Кітаі (але тады трэба мець такія гіганцкія рэсурсы, як у КНР, і такія тэмпы росту эканомікі, пры якіх страта пары мільярдаў даляраў ня маюць вялікага значэньня), альбо больш гнуткая палітыка, як у расейскіх уладаў, якія спрабуюць выкарыстаць інтэрнэт у якасьці дадатковага, вельмі эфэктыўнага прапагандысцкага рэсурсу.

Спробы цяперашняга кіраўніцтва РБ абясшкодзіць заразу інтэрнэту нагадваюць мне забарону кібэрнэтыкі ў СССР у канцы 40-х гадоў — разам з генэтыкай. Кібэрнэтыку тады называлі ў савецкім друку ня йначай як «прадажнай дзеўкай амэрыканскага імпэрыялізму». У выніку на ўсёй пастсавецкай прасторы займаюцца цяпер выключна зборкай кампутараў, а ня іх вытворчасьцю ці праграмным забесьпячэньнем.

## Мінус савецкая ўлада

Не даводзіцца сумнявацца, што большая частка намэнклятуры ў Беларусі, якая вырасла ва ўмовах савецкай, а потым лукашэнкавай вэртыкалі, прывыкла думаць забараняльнымі катэгорыямі. Цяперашняя ўлада спрабуе змагацца са зьявай, якой яна ў поўнай меры яшчэ нават не разумее. Але посьпехаў у гэтым кірунку, думаю, будзе ня больш, чым у спробах змагацца з распаўсюджаньнем ядравай зброі ў трэцім сьвеце, альбо ў змаганьні са спадарожнікавымі талеркамі ў Іране.

Магчыма, мы ўбачым некалькі судовых працэсаў над правайдэрамі (адзін такі ўжо ідзе), ці нават над аўтарамі асобных сайтаў. Прыкладна тое, што можна назіраць сёньня ў Расеі.

Але ж інтэрнэт-тэхналёгіі разьвіваюцца нагэтулькі імкліва, што ўлады заўсёды будуць спазьняцца ў сваіх паліцэйскіх памкненьнях паставіць плаціну на шляху патокаў інфармацыі. Пагаджуся з Натальляй Радзінай, якая сказала ў інтэрвію «НН», што ў выпадку ўвядзеньня цэнзуры й блякаваньня апазыцыйных сайтаў інтэрнэт-актыўнасьць перасунецца ў благасфэру. Але ў гэтым выпадку, трэба ўсьведамляць, адбудзецца яшчэ большая маргіналізацыя і атамізацыя тае часткі грамадзтва, якая пакуль выяўляе палітычную актыўнасьць. І акрамя таго, безумоўна, яшчэ больш вырасьце ўплыў рунэту (зь якім уладам будзе справіцца куды больш складана, чым зь белнэтам) на беларускую аўдыторыю. Гэтую небясьпеку цяперашнняя ўладная эліта, думаю, хутка ўсьвядоміць.

Але варта памятаць і пра тое, што інтэрнэт, пры ўсім яго сапраўды глябальным значэньні, сам па сабе ня ёсьць вырашэньнем ніводнай праблемы. Ён і сам ёсьць праблемай. Асабліва ў сёньняшняй Беларусі зь яе станам разьвіцьця грамадзтва. Спадзяваньні, быццам спадарожнікавае тэлебачаньне, глябальнае сеціва альбо іншыя найноўшыя дасягненьні тэхнічнай думкі аўтаматычна дапамогуць усталяваньню дэмакратыі ў Беларусі нагадваюць вядомы лёзунг: «камунізм ёсьць савецкая ўлада плюс электрыфікацыя ўсёй краіны». (Нейкі вастраслоў слушна заўважыў: а капіталізм ёсьць электрыфікацыя ўсёй краіны мінус савецкая ўлада.)

Усеагульная інтэрнэтызацыя Беларусі — зусім не гарантыя духоўнага здароўя нацыі. Трэба было б у інтэрнэце выстаўляць папярэджаньне, як на пачках цыгарэтаў: карыстаньне сецівам можа прычыніць урон вашаму здароўю і маралі.

# Савецкая Беларусь на ўсходзе Ўкраіны




Азоўскае мора — добрае месца для адпачынку. Тут, у параўнаньні з Крымам, таньней і ня так тлумна. Адно што цалкам адпачыць ад беларускай рэчаіснасьці на ўсходзе Ўкраіны не атрымаецца. Піша **Сямён Печанко**.

## Мэталюргічна-курортная сталіца

Як толькі цягнік «Менск-Марыупаль» прыходзіць на канцавы пункт, у галаву прыходзіць пытаньне — як тут жывуць людзі? Паўмільённы горад патанае ў дыме, што безупынку ідзе са шматлікіх заводзкіх трубаў. Уявіце сабе Горадню, па краёх застаўленую пяцьцюшасьцю «Азотамі», ды яшчэ колькі «Азотаў» у цэнтры. Мясцовы мэталюргічны гігант — завод імя Ільіча, на якім працуе 30 тыс. чалавек, мае калясальны ўплыў на эканамічнае разьвіцьцё рэгіёну. Акрамя працоўных месцаў гэта й выкупленыя калгасы, пераўтвораныя ў аграцэхі, гіганцкая гандлёвая сетка «Ільіч-маркет», бясплатныя аўтобусныя маршруты для рабочых ды пэнсіянэраў, безадсоткавыя ды ільготныя крэдыты для пэрсаналу прадпрыемства. Выдаецца 50-тысячным накладам газэта «Прыазоўскі рабочы». Хіба толькі ў турыстаў выклікае ўсьмешкі шыльда на гарадзкой аптэцы «Ільіч-фарм».

Зайздроснымі тэмпамі тут разьвіваецца прыватная ініцыятыва: крамкі і гандлёвыя цэнтры, рэстарацыі і кавярні, кірмашы і кірмашыкі, пункты пракату і мноства рэклямы.

Марыупаль — мэталюргічная сталіца Ўкраіны. Акрамя ўсяго ён мае яшчэ й курортнае значэньне. Аднак адпачынак у такім месцы адразу ж падаўся сумнеўным, асабліва яго курортны складнік. Таму кіруемся ў рыбацкае сяло Шырокіна, што ў 25 км ад Марыупалю.

## Ад бараку да гатэлю

Шырокіна — нерасьпешчанае турыстамі сяло, таму мясцовыя жыхары прапануюць неблагое па коштах і камфорце жытло. Часьцей за ўсё гэта летняя хатка ў двары, але ўсё больш зьяўляецца збудаваных з сылікатнай цэглы буданчыкаў, што зьнешне нагадваюць хлявы ў нашых аграгарадках.

У адным пакоі месьціцца колькі ложкаў (у разьліку на сям'ю) ды невялікі стол. Прыбіральня, як правіла, на двары, як і душ, у якім вада награецца ад сонца. Гатаваць даводзіцца на агульнай кухні. Каштуюць такія памяшканьні ў залежнасьці ад адлегласьці да мора ад 3 да 5 даляраў з чалавека за суткі. Для мясцовых адлегласьць да пляжу ў кілямэтар — нерэальная для нармалёвага бізнэсу далечыня.

Можна знайсьці гаспадароў, што здаюць пакоі ва ўласным доме. Увогуле, турысты — ці не адзіная крыніца падтрыманьня дабрабыту мясцовых жыхароў, асабліва пэнсіянэраў.

Ёсьць у Шырокіне й гатэль з рэстаранам, басэйнам, кандыцыянэрамі ды стрыптыз-шоў чатыры разы на тыдзень. Спыніцца ў ім каштуе ад $40 за суткі, на шыльдзе — чатыры зоркі. Ёсьць і таньнейшыя варыянты — мясцовыя пансіянаты ды камфартабэльныя мінігатэльчыкі проста на беразе мора.

Зь мясцовых адметнасьцяў можна вылучыць нядаўна збудаваную цэркаўку, музэй народнага мастака Ўкраіны Міколы Ясіненкі, разьмешчаны ў мясцовай школе, а



Працяг на старонцы 26.

# Вялікі дзякуй

**Сяргею У.** з Бабруйску
**Віталю Ц.** са Жлобіна
**Г.Ш.** зь Мядзельскага раёну
**Ніне К.** з Горадні
**Руслану Г.**, **Анжэле Б.**, **Георгію Р.**, **Валеру П.** з Баранавічаў
**Кацярыне П.** з Мазыра
**Алесю П.** з Наваполацку
**Г.** з Мастоў
**А.Ш.** з Аршанскага раёну
**Т.Б.**, **І.М.** з Магілёва
**Горгію С.** з Воршы
**Інэсе З.** з Турава
**Вользе Ж.** з Барысава
**Віктару Б.** з Смалявічаў
**Віктару Я.** з Салігорскага раёну
**Канстанціну К.** з Шаркоўшчынскага раёну
**Віктару А.**, **Ірыне Я.** зь Берасьця
**Васілю Р.**, **Уладзіславу І.** зь Віцебску
**В.К.**, **Раману М.**, **С.К.**, **Уладзіславу Ж.**, **Л.Г.**, **Казімеру Г.**, **Н.Р.**, **Тацяне П.**, **Міхаілу Ш.**, **Андрэю С.**, **Ксеніі Ф.**, **Алесю Л.**, **В.К.**, **А.С.**, **Івану Ш.**, **Генадзю К.** зь Менску

Заклікаем **чытачоў**, якія атрымліваюць газэту, але **яшчэ не прыслалі дамовы**, зрабіць гэта як найскарэй. З пытаньнямі пра дамовы, аплату і дастаўку зьвяртайцеся праз тэл.: (017) 284–73–29, (029) 260–78–32, (029) 618–54–84.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перараказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## У докшыцкай моладзі — свая газэта

**У Парфенаве падрыхтаваны да друку першы нумар моладзевай культурніцка-рэлігійна-асьветніцкай газэткі Докшыцкага раёне «Прамень».** Газэтка будзе мець памер чатыры старонкі фармату А4, выходзіць будзе раз на два месяцы.

Як паведамляе рэдакцыйны артыкул, зьмешчаны на чацьвёртай старонцы, «газэтка робіцца моладзьдзю і для моладзі». У ёй можна будзе знайсьці інфармацыю аб цікавых падзеях, таленавітых людзях, гісторыі краю. Вялікая ўвага будзе надавацца рэлігійнай тэматыцы.

**Антось-дысыдэнт з фальварку Ямнае**

## Бел-чырвона-белы ў Маскве

**На ўваходзе ў «Крокус-цэнтар»**, на флягштоку, побач з расейскім, грузінскім, літоўскім і іншымі вісіць ЁН. Лукашэнкаўскага няма. Ня ведаю, хто ў гэтым «вінаваты», але душу парадавала.

**Яўген, Масква**

## Дзень Салідарнасьці ў Жлобіне

**Мясцовыя маладафронтаўцы зранку вывесілі ў горадзе адразу ж дзьве расьцяжкі** — «Свабоду Дашкевічу» й «Рэпрэсіі нас ня спыняць!». Зьмест апошняй добра падыходзіць да сучаснага становішча, у якім знаходзяцца маладыя людзі, якія так ці інакш зьвязаныя зь незарэгістраванай маладзёвай арганізацыяй «Малады Фронт».

Расьцяжкі зьявіліся ў людных месцах: скрыжаваньне каля Палацу спорту і на цэнтральнай плошчы. Гэтая апошняя правісела каля 40 хвілінаў.

Выйшла так, што яе зьнялі вясковыя хлопцы, што ішлі з аўтавакзалу па плошчы. З крыкамі «ой, бл...» яны падбеглі да расьцяжкі і сьцягнулі яе, а потым пачалі крычаць «Свабоду папугаям!»

Так здарылася, што гэтыя хлопцы селі менавіта на той самы цягнік, у якім ехаў да бабулі наш сябар Кірыла.

Кірыла апавядае:

— Яны брыдка паводзілі сябе ў цягніку. Ляжалі на лаўках і не давалі іншым сесьці. Прыйшлі два міліцыянты й папярэдзілі хлапцоў, каб тыя паводзілі сябе больш сьціпла. Тады яны хуценька ўзьняліся й селі на лаўкі, як нармалёвыя людзі. Пры гэтым яны ехалі яшчэ й без квіткоў, таму міліцыянтам давялося ехаць зь імі да канцавога прыпынку.

З усяго гэтага вынікае, што прапаганда добра працуе й акучвае новае пакаленьне «беларускай» моладзі, якое павінна стаць надзейнай апораю для паноўнага аўтарытарнага рэжыму.

**З-над Дняпра**

## Плыві ў даль, чоўн, воляй хваль...

**Даруйце недасканалы пераклад, гэтыя словы неяк самі паўсталі, калі прачытаў водгук Сяргея Петрыкевіча** («НН», №10'2007) на артыкул Янкі Саламевіча пра мову Беларускага радыё («НН», №8'2007).

І хоць прайшло ўжо колькі месяцаў з часу зьяўленьня публікацый Я.Саламевіча і С.Петрыкевіча (на жаль, яны ня выклікалі дыскусіі), актуальнасьць узьнятай у іх праблемы (культура мовы) не паменшала.

Дзякуй Янку Саламевічу, якому ці не аднаму з сотняў беларускіх пісьменьнікаў, журналістаў, лінгвістаў так зарупіў боль роднага слова, што ён ня мог сьцярпець і не пагрэбаваў чарнавой працай, каб сабраць і ляканічна патлумачыць шматлікія моўныя факты, якія сьведчаць пра хібы ў мове Беларускага радыё. Гэтыя факты досыць тыповыя, іх неабавязкова пашпартызаваць. У выпадку разгляду публікацыі Я.Саламевіча на вытворчых нарадах ці ў працэсе самаадукацыі кожны супрацоўнік радыё безь цяжкасьці «пазнае» свае моўныя агрэхі і пры жаданьні можа іх пазбавіцца.

Каштоўна тое, што філёляг старэйшага пакаленьня перадае досьвед уважлівага слуханьня і ацэнкі гучальнага слова маладым людзям, у прыватнасьці працаўнікам гуманітарнай сфэры.

Ня раз і я парываўся адгукнуцца ў друку на якасьць некаторых радыё- і тэлеперадач, занатоўваў парушэньні нормаў вымаўленьня, націску, увогуле словаўжываньня. Напрыклад: *гурбА сьнегу, Убрана палова плошчы*, выкарыстаньне сьцьвярджальнай часьціцы (русізму) *да* замест правільных *так, але, ага* ды іншых у дыялёгу. Як добра, што вялікую частку і маіх падобных назіраньняў увабраў зьмястоўны артыкул Я.Саламевіча.

Слушную крытыку на адрас Беларускага радыё С.Петрыкевіч успрыняў як паклёп. У адрозьненьне ад «неаб'ектыўнага» аўтара артыкула, ён узяў на сябе ролю «праўдзівага» летапісца і прарока — калі падае зьвесткі з гісторыі і сёньняшняга дня беларускага радыё і тэлебачаньня, калі вяшчуе невясёлы лёс радыё і беларускай мовы ў яго праграмах. С.Петрыкевіч, аднак, ня робіць спробы схаваць сваё аўтарытэтнае «я», асабліва там, дзе яму чамусьці трэба падтрымаць і нават пахваліць раыё. Думаецца, калі б гэтае «я» (у водгуку ўжыта пяць разоў) скіраваць на абарону беларускай мовы, то задача яе захаваньня і дасканаленьня не была б такою невырашальнаю, як мяркуе С.Петрыкевіч.

...Памятаю на спэцсэмінары даклад Сяргея Петрыкевіча — здольнага, сур'ёзнага студэнта. Ён вывучаў культуру мовы пэрыядычнага друку, у прыватнасьці газэты «Звязда». Былі зробленыя тонкія назіраньні адносна правільнасьці формы слова, яго ўжываньня. Праўда, у студэнтаў аналіз часам выклікаў нязгоду: завялікая была прывязанасьць да акадэмічных слоўнікаў. Ведаем жа: слоўнікі і граматыкі не заўсёды і ня поўна адлюстроўваюць праявы жыцьця слова. Моўная практыка багацейшая за ўсякія слоўнікі і граматыкі.

А цяпер мяне проста ашаламіла: той самы Петрыкевіч, які яшчэ нядаўна выпрацоўваў і адстойваў у студэнцкім дасьледаваньні паняцьце моўнага ідэалу (безь яго не разьвіваецца літаратурная мова), фактычна адмаўляе беларускай мове ў магчымасьці і патрэбе дасягнуць належнага ўзроўню — крыху вышэйшага, чым сёньня валодаюць Ю. Зайцаў ці У.Трапянок. Першаму, насуперак сьцьверджаньню С.Петрыкевіча, выяўна не стае мяккасьці вымаўленьня зычных. Напрыклад, у назьве перадачы «Служба бясьпекі», якую рэгулярна вядзе Ю. Зайцаў, у абодвух словах *с* гучыць цьвёрда. Хацелася б чуць болей «сакавітасьці» у адметным голасе У.Трапянка.

Не баіцца грэху С.Петрыкевіч за свае несправядлівыя ўпікі, зьдзеклівы тон на адрас беларускай мовы і яе адданых носьбітаў: «праслаўтае асыміляцыйнае пом'якчэньне», «добразычліўцы».

Згодны з «гістарычнай» часткай артыкулу С.Петрыкевча, дзе гаворыцца, што ў савецкія часы аддавалася шмат увагі падрыхтоўцы матэрыялаў для перадач радыё, вучобе дыктараў. Існавала добрая практыка ўлічваць думку слухачоў. Канкрэтызую.

У 50-я студэнты Менскага пэдагагічнага інстытута імя М. Горкага Валянцін Рабкевіч і Кім Скурат выказалі заўвагі ("ЛіМ", 18.04.1959) пра дыктарскае вымаўленьне на Беларускім радыё некаторых слоў, у тым ліку прозьвішча *Се*дзельнікава. Тады супрацоўнікі радыё ня сталі шукаць лінгвістычнага апраўданьня, каб вымаўляць «пашпартны» запіс прозьвішча, а пагадзіліся зь беларускім слыхам і густам студэнтаў. З таго часу мы не адно дзесяцігодзьдзе з прыемнасьцю чулі: «Чытала дыктар *Ся*дзельнікава».

Бясспрэчна, на Беларускім радыё, апрача названых С.Петрыкевічам дыктараў са знакам «плюс» (Сьвятлана Шушакова, Маргарыта Захарыя), ёсьць і іншыя прадстаўнікі добрай «старой школы» — Кацярына Несьцяровіч (цяпер Ягорава?), Уладзімер Баклейчаў. Падабаецца і мне мова Віктара Бабея, Міхася Дрынеўскага...

Каб жа толькі прафэсійная дасьведчанасьць і творчы набытак працаўнікоў слова перадаваўся як мага большай колькасьці беларускіх моўцаў!

Нейкай разгубленасьцю, няўпэўненасьцю вее ад напісанага С.Петрыкевічам. Аўтар водгуку апынуўся ў становішчы лодкі, гнанай хвалямі: «Адны памылкі пройдуць, а другія зьявяцца — што зробіш, людзям у прынцыпе ўласьціва памыляцца».

Поўны пэсымізм! Адна надзея: мінуць часы ўсякія (значыць, сядзі ціха і чакай). На жаль, так расчытваецца сэнс Сяргеевых нататкаў.

Ці гэта шчыра, ад душы?!

**Алесь Каўрус, кандыдат філялягічных навук**

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

У артыкуле «Расстраляная археалёгія» ў №30 у першым абзацы замест «Іх расстралялі ... 28 жніўня 1937 году» трэба чытаць «Іх расстралялі ... 27 жніўня 1937 году».

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# «Гэта яшчэ мінімум на 20 гадоў»

У Менску ў «Кінафармаце 4х4» паказалі новае кіно пра «Штазі».

Усходні Бэрлін. 1984 год. Спэцслужба «Штазі» жорстка кантралюе жыцьцё грамадзянаў. Фанатычнаму капітану Герду Візьлеру загадваюць сачыць за драматургам Дрэйманам і ягонай сяброўкай. Апэрацыя праходзіць пад пільным кантролем вышэйшых палітычных колаў. Выкананьне заданьня абяцае кар'ерны ўзьлёт.

Атмасфэра сацыялістычнай задухі, таталітарны ціск, карупцыя і кар'ерызм, анэкдоты і дысыдэнцтва. Рэжысэр і сцэнарыст Донэрсмарк некалькі гадоў вывучаў мэтады «Штазі», сустракаўся з ахвярамі й былымі агентамі. Здымкі вяліся ў колішнім будынку тайнай паліцыі.

Капітан Візьлер у выкананьні Ульрыха Мюэ — шэры чалавечак, адданы салдат партыі. Сталёвыя вочы, непрыкметны касьцюм, аніякага асабістага жыцьця. Візьлер сочыць за драматургам: чужое каханьне й чужое сяброўства, падслуханая музыка, прачытаны томік Брэхта… І пакрысе цяплее твар, прачынаецца сумленьне. У вачох ужо не фанатызм, а боль і пакута маленькага чалавека, які спачувае — і здольны на годны ўчынак. Ульрых Мюэ сыграў найлепшую сваю ролю.

Гэты актор, які нечакана памёр 22 ліпеня, сам калісьці ўдзельнічаў у палітычных дэманстрацыях. Пасьля падзеньня Бэрлінскай сьцяны ён даведаўся, што ягоная жонка супрацоўнічала са «Штазі».

«Людзі не зьмяняюцца, — нахабна сьцьвярджаюць тлустыя чыноўнікі зь фільму, пэўныя ў сваёй вечнай уладзе. — Гэта яшчэ, як мінімум, на 20 гадоў».

Бэрлінская сьцяна абрынулася празь пяць гадоў.

**Андрэй Расінскі**




**Жыцьцё іншых** (Das Leben der Anderen)

Нямеччына, 2006, каляровы, 137 хв. Рэжысэр: Фларыян Хенкель фон Донэрсмарк. Жанр: Драма. Прызы: 7 прызоў Нямецкай кінаакадэміі, у тым ліку за найлепшую мужчынскую ролю, найлепшы фільм, найлепшы сцэнар; «Оскар» за найлепшы замежны фільм; 3 прызы Эўрапейскай кінаакадэміі за найлепшы сцэнар, найлепшы фільм, найлепшую мужчынскую ролю — усяго 42 узнагароды і 10 намінацыяў.

## СЬЦІСЛА

### N.R.M. на аэрадроме

Беларускі гурт рыхтуецца да ўдзелу ў фэстывалі «Muzyka z oblężonego miasta» 2 верасьня ў польскім Любіне на мясцовым аэрадроме. N.R.M., прадстаўленыя на сайце фэстывалю як «беларуская Nirvana», адкрыюць апошні дзень фэсту. Яшчэ там будуць Боб Гелдаф (той, што сыграў галоўную ролю ў фільме «Сьцяна» Pink Floyd), гурты The Plastic People of Universe, The Ukrainians ды іншыя.

### Радзівіл у Маскве

«Чатыры стагодзьдзі беларускай вакальнай музыкі» прадставіла ў Маскве ў рамках Міжнароднага музычнага фэстывалю «Зьбіраем сяброў» Беларуская акадэмія музыкі. У праграме былі кампазыцыі невядомых аўтараў XVII—XVIII ст., творы Антонія Радзівіла, Міхала Клеафаса Агінскага, Станіслава Манюшкі, Напалеона Орды. Вечар беларускага вакалу прайшоў у славутай Рахманінаўскай залі Маскоўскай кансэрваторыі.

### Барадулін па-японску, а Купала па-француску

У Токіё выйшла кніга вершаў народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна ў перакладзе на японскую мову «Малітва ветру». У 166-старонкавае выданьне ўвайшлі вершы з зборнікаў «Ксты» і «Быць». Аўтар перакладу — Кашына Гоў — працаваў у амбасадзе Японіі ў Беларусі. Перакладаў ён таксама творы Алеся Адамовіча і Ўладзімера Караткевіча.

На канец верасьня заплянаваная менская прэзэнтацыя зборніка. Творы Р.Барадуліна перакладзеныя на 30 моваў сьвету.

Дарэчы, нядаўна Віржынія Шыманец пераклала на францускую «Тутэйшых» Купалы. Аднаслоўнага перакладу не знайшлося: па-француску гэта гучыць «Les gens d'ici», літаральна «людзі адсюль».

### Беларускія і літоўскія ткальлі сустрэліся ў Полацку

17 жніўня ў Полацкай карціннай галерэі адкрылася выстава «Мастацкі тэкстыль» (Беларусь-Літва). У экспазіцыі — працы 9 літоўскіх і 12 беларускіх мастакоў. Сярод удзельнікаў выставы вядомыя майстры: С.Каткова, Н.Пілюзіна, Л.Скрыпнічэнка, Л. Пятруль, Т. Козік. У дзень адкрыцьця адбыўся майстар-кляс па батыку, які праводзіла старшынька літоўскай Тэкстыльнай гільдзіі Яланта Шмідтэнэ.

Літоўскім мастакам спадабалася полацкая мастацкая галерэя. Музэй знаходзіцца ў корпусе былога езуіцкага калегіюму і мае багатую калекцыю беларускага выяўленчага мастацтва другой паловы XX ст. Беларускія і літоўскім мастакі дамовіліся правесьці шэраг агульных мастацкіх праектаў.

**SB, Тузін гітоў, БЕЛТА, Алесь Аркуш**

# Апошнія ліцьвіны кінэматографу

Пра Ўладзіслава Старэвіча і Абрама Роама піша **Андрэй Расінскі.**

Гэтыя рэжысэры былі нібыта апошнія паслы Вялікага Княства. Іх творы настолькі дзіўныя, што ня маюць прапіскі ў сусьветным кіно. Магчыма, таму што зьяўляюцца аскепкамі забытай культуры.

## Таямніцы Ўладзіслава Старэвіча

Бацька лялечнай анімацыі Ўладзіслаў Старэвіч нарадзіўся 125 гадоў таму 8 жніўня. Адны даведнікі гавораць, што Старэвіч нарадзіўся ў Коўне, другія падаюць Вільню. Трэцяя вэрсія — у Маскве. Але дакладна што ў сям'і ліцьвінскай, беларускай шляхты Антаніны й Аляксандра Старэвічаў.

Калі Ўладзіславу было 10 гадоў, ён да «Чароўнага ліхтара» (цацкі кшталту дыяпраектара) дадаў прыстасаваньне ўласнае зборкі і наладзіў хатнія спэктаклі. Хлопец захапіўся энтамалёгіяй, фатаграфіяй, пачаў браць урокі жывапісу — але на гэта бракавала грошай.

У Коўне пасталелы Старэвіч служыў у Казённай палаце, выпускаў энтамалягічны часопіс і сатырычную газэту «Крамзолі і кляксы», маляваў афішы. Калі Старэвіч падараваў Ковенскаму этнаграфічнаму музэю свой альбом фатаграфій, археоляг Тадэвуш Доўгірд прапанаваў юнаку зьняць этнаграфічны фільм.

У 1909 г. Старэвіч адправіўся ў Маскву. У францускай фірме «Браты Патэ» віленскага шляхціца абсьмяялі. Сытуацыя паўтарылася ў кампаніі «Гамон». Але на Старэвіча зьвярнуў увагу расейскі прадпрымальнік Аляксандар Ханжонкаў — і даў яму кінакамэру.

На радзіме Старэвіч зьняў першы фільм: **«Над Нёманам»**. Карціна не захавалася. Ханжонкаву Старэвіч прывёз адразу тры фільмы **«Над Нёманам», «Жукі-скарабеі» і «Жыццё стракозаў»**.

Карціна 1910 г. **«Lucanus Cervus»** (таксама страчаная) стала першай у сьвеце лялечнай анімацыяй. Старэвіч хацеў паказаць бойку жукоўрагачоў за самку, але пад сьвятлом пражэктараў жукі рухацца не жадалі. Тады, нібыта, Старэвіч узяў панцыры жукоў і «ажывіў» іх пакадрава, прымацаваўшы замест лапак танюткі дрот.

Фільм 1912 г. **«Чароўная Люканіда, альбо Вайна рагачоў з вусачамі»**, таксама вядомы пад гульліваю назвай «Куртызанка на троне», стаў сусьветнай сэнсацыяй. Фірма «Патэ» кусала локці ад зайздрасьці — і набыла стужку для замежнага пракату.



**Уладзіслаў Старэвіч**

нар. у 1882 ці то ў Вільні, ці то ў Коўне, ці то ў Маскве, Здымаць пачаў у 1909 з дапамогай прадпрымальніка Ханжонкава. Аўтар лялечных анімацыйных і мастацка–анімацыйных нямых і гукавых стужак. Найлепшая карціна — «Рэйнэке–ліс» (1941). Памёр у Францыі ў 1965.



**Рэйнэке-ліс.**

У карціне «Чароўная Люканіда» былі амурныя жарсьці, стары муж, маладая жонка, галянтны рыцар… але ўсе ролі выконвалі насякомыя. У самых патэтычных сцэнах гледачы плакалі ад сьмеху.

Парадыйна-мэлядрамныя прыгоды разгортваліся і ў **«Помсьце кінэматаграфічнага апэратара»**. Жук, здрадзіўшы жонцы, заляцаецца да страказы, жучыха гуляе з вусачом, а пакрыўджаны конік-папарацы здымае адультэр, каб паказаць яго ў кінатэатры.

У залаты фонд кінэматографу ўвайшлі стужкі Старэвіча 1913 г. **«Каляды ў жыхароў лесу», «Вясёлыя сцэнкі з жыцьця жывёлаў», «Страказа і мураш»** (паводле Крылова).

Зьдзіўленая прэса пісала, што Старэвіч… дрэсіруе жывёлаў. «У адным месцы карціны зьдзіўляе дрэсіраваная страказа, якая, стоячы на ружы, круціць ручку маленечкага здымачнага апарата», — пісаў аглядальнік пра **«Авіяцыйны тыдзень казурак»**.

Але Старэвіч жывёл не дрэсіраваў. Ён рабіў іх найдакладнейшыя макеты. Як? Тэхніка засталася таямніцаю рэжысэра, якую ведалі толькі жонка Антаніна і дочкі Ірына і Яніна.

Учацьвярох яны рабілі працу цэлае кінастудыі. Уолт Дыснэй з зайздрасьцю гаварыў: «Гэты чалавек апярэдзіў усіх мультыплікатараў сьвету на некалькі дзесяцігодзьдзяў».

Старэвіч паспрабаваў сябе і ў гульнявым кіно. **«Страшная помста»** паводле Гогаля ў 1912 г. атрымала Залаты мэдаль у Міляне. А фільм **«Ноч на Каляды»** сумяшчаў актора Мазжухіна і анімацыйнага чарта.

У 1918 г. Старэвіч зьняў у Ялце **«Зорку мора»**, выкарыстаўшы найскладанейшыя эфэкты: шматлікія экспазыцыі праз карункі пены, рухомая карона з чалавечых целаў на тле неба… З савецкай уладай у ліцьвіна Старэвіча не было нічога супольнага — і ён эміграваў спачатку ў Італію, а затым у Францыю.

Там зьняў дасьціпныя мультфільмы **«Ў лапах павука»** (1920), **«Жабкі патрабуюць караля»** (1922), **«Пацук гарадзкі і пацук палявы»** (1926). А карціна паводле Андэрсэна **«Голас салаўя»** (1923) выклікала захапленьне ў Амэрыцы. Старэвіч прыдумаў і сэрыю пра пацешнага



**Старэвіч рабіў дакладныя макеты кузурак з драбнюткіх дэталяў. Тэхніка засталася таямніцай рэжысэра.**

шчанюка Фэтыша, якія цяпер цытуе студыя «Піксар».

Дый самі карціны Старэвіча глядзяцца надзвычай сучасна. Як «касьцюмная» казка **«Рэйнэке-ліс»** па матывах францускага эпасу й казкі Гётэ.

Фільм быў распачаты ў 1928 г. Выкарыстоўваліся разнастайныя лялькі: ад 10 см да памераў у чалавечы рост. Для кожнай жывёліны — ганарлівага ільва, хітрага ліса, баязьлівага зайца і зьедзенай курыцы — рабілася да 500 масак. Грымасы анімацыйных герояў былі жвавыя й рухомыя. (Таямніца матэрыялу, зь якога Старэвіч ляпіў лялькі, засталася невядомай.)

Але пры канцы 30-х у кіно прыйшоў гук, і карціна мусіла перарабляцца. Грошы на даробку казкі Гётэ дала Нямеччына, дзе да ўлады прыйшлі нацысты. «Рэйнэке-ліс» выйшаў у 1941 г. па-француску — і стаўся непераўзыдзеным. Але фінансаваньне стужкі гітлераўскім урадам сапсавала яе пракатны лёс — і карціна дасюль мала вядомая гледачу.

Неўзабаве пасьля тых здымак дачка Ірына пачала сьлепнуць. Старэвіч здымаў рэклямныя ролікі і распрадаваў унікальныя лялькі. Памёр Старэвіч 26 лютага 1965 г. пад Парыжам у мястэчку Фантэн-Дэ-Буа.

Унікальны сьвет Старэвіча ня мае аналягаў — і застаецца загадкай забытага Княства зь яго лялечным арыстакратызмам.

Кіназнаўца Аляксандар Арну скардзіўся: «Не паеду я да Старэвіча… Не жадаю, каб ён ператварыў мяне ў камень або напусьціў сваіх гномаў, дамавікоў, духаў, сваіх жудасных мух і цмокаў зь зіхоткімі дыямэнтамі вачэй...» На што Старэвіч адказваў: «Сакрэта асаблівага няма. Усё гэта карпатлівая праца…»

## Віленскі габрэй Савецкага Саюзу

Віленскі габрэй Абрам Роам нарадзіўся 28 чэрвеня 1894 году ў Вільні. У 1914—17 гадох ён навучаўся ў Петраградзкім псыханэўралягічным інстытуце, а з 1917 да 1922 — у Саратаўскім мэдуніверсытэце. Адначасова працаваў у Саратаўскім аддзеле мастацтваў выкладчыкам і рэжысэрам у Паказальным і Дзіцячых тэатрах. З 1923 году Роам стаў рэжысэрам тэатру Рэвалюцыі ў Маскве, дапамагаў Меерхольду ставіць «Возера Люль».

У карціне 1927 году **«Пацалунак Мэры Пікфард»** Абрам Роам, які ўваходзіў у «вялікую пяцёрку савецкага кіно», зьяўляецца ў кадры ў ролі… рэжысэра. Годная постаць, жэсты, якія ня маюць нічога агульнага з «пралетарскім калектывізмам».

Першая ж гульнявая стужка Роама **«Бухта сьмерці»** (1926), нягледзячы на абавязковы рэвалюцыйны патас, спрачалася з «Браняносцам «Пацёмкіным». Годнасьць чалавечых пачуцьцяў, культура кадру… і нешта яшчэ.

Талент Роама выбухне ў нямым шэдэўры **«Трэцяя Мяшчанская»** 1927 г. Сцэнарыст Віктар Шклоўскі прапаноўваў сюжэт Юр'ю Тарычу, але той адмовіўся. У фільме Роама жанчына не хавае палюбоўніка ад мужа — і ўсе жывуць утраіх. Калі гераіню адсылаюць «рабіць аборт у складчыну», яна зьяжджае з Трэцяй Мяшчанскай разам зь ненароджаным дзіцём.

Скандальны сюжэт (узяты з газэтаў) — Шклоўскага таксама папракалі за нетактоўнасьць да Брыкаў і Маякоўскага. Але цнатлівасьць, псыхалягізм, арыстакратызм кадру, раскоша блізкія да стылю Жана Както.

Хаця ў фільме зьяўляецца партрэт Сталіна, сучасныя крытыкі называюць «Трэцюю Мяшчанскую» адным з самых антысавецкіх фільмаў. Калі ў 1989 г. карціну ізноў паказалі на Захадзе, эўрапейцы прызналі яе сучаснаю і сваёй.

Карціна **«Прывід, які не вяртаецца»** (1929) зьнятая паводле навэлі Анры Барбюса. Вязьня выпускаюць на 24 гадзіны, і, калі ён ня вернецца, яго заб'е шпег. Турма ў фільме нагадвае позьнія кінажахі Гадара і трызьненьні філёзафа Мішэля Фуко.



**«Трэцюю Мяшчанскую» Роама называлі адным з самых антысавецкіх фільмаў.**

Але самы таямнічы фільм Роама — **«Суворы юнак»** 1936 г., вядомы таксама як «Камісар побыту», «Дыскабол» і «Чароўны камсамолец». Карціна здымалася ва Ўкраіне па сцэнары Юр'я Алешы. Дзеяньні адбываюцца ў ідэальнай «савецкай» будучыні, герой-камсамолец закаханы ў жонку прафэсара; той — мізэрны ганарлівец. Партрэты Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна, гутаркі пра камунізм, але ніякага камунізму. Дзяўчына прапаведуе Ніцшэ (!), героі нагадваюць антычныя статуі, дзівосныя карункі жалезнага плоту, сьненьні, якім пазайздросьцілі бы нямецкія экспрэсіяністы.



**Абрам Роам**

нар. у 1894, у 1917—22 паралельна з мэдычнай, атрымліваў тэатральную адукацыю. У 1927 ужо ўваходзіў у пяцёрку найлепшых савецкіх рэжысэраў. Хоць яго карціны зь цяжкасьцю ўпісваліся ў савецкія каноны.

Фільмы Абрама Роама можна паглядзець у Музэі гісторыі кіно(вул.Сьвярдлова, 4), папярэдне замовіўшы па т.: (017) 227–10–75.

Такога эўрапейскага дэкадансу Роаму дараваць не маглі: карціна імгненна была забаронена, над жыцьцём рэжысэра навісла пагроза.

З таго часу ён стаў вельмі абачлівым. Але нават у адыёзныя ідэалягічныя фільмы 50-х (**«Срэбны пыл»** ці **«Суд гонару»**, пра выхаваньне навукоўца-касмапаліта — Роам уводзіў адзеньне, твары і жэсты зусім не савецкія. У вайсковым фільме **«Нашэсьце»** (1944) — адзін з герояў — былы рэпрэсаваны, а статная маці героя (Вольга Жызьнёва) зрабіла б гонар любой карціне пра шляхту.

Апошнія, дыямэнтавыя стужкі Роама 70-х паводле Купрына, Чэхава, Горкага (**«Гранатавы бранзалет»**, **«Кветкі запозьненыя»**, **«Дачасны чалавек»**), здаецца, цалкам улучаюць нараджэнца Віленшчыны ў расейскую культуру. Але культурная празьмернасьць, пекнае шляхецтва застаюцца адбіткам Княства, пра якое мы ўсе забылі.

# Дзе паглядзець клясыку

У Музэі гісторыі кіно можна замовіць мастацкія фільмы паводле літаратурных твораў, а таксама дакумэнтальныя стужкі пра выбітных асобаў і значныя падзеі ў гісторыі Беларусі.

**Алесь Адамовіч:**
— «Вайна пад стрэхамі» (1967), рэж. У.Тураў, 97 хв., кіно;
— «Сыны ідуць у бой» (1969), рэж. У.Тураў, 96 хв., кіно / відэа;
— «Ідзі і глядзі» (1985), рэж. Э.Клімаў, 145 хв., кіно.
**Зьмітрок Бядуля:**
— «Салавей» (1937), рэж. Э.Аршанскі, 65 хв., ч/б, кіно.
**Васіль Быкаў:**
— «Трэцяя ракета» (1963), рэж. Р.Віктараў, 78 хв., ч/б, кіно;
— «Альпійская баляда» (1965), рэж. Б.Сьцяпанаў, 95/87 хв., ч/б, кіно / відэа;
— «Пастка» (1966), рэж. Л.Мартынюк, 29 хв., ч/б, кіно;
— «Жадаю посьпеху» (1968), рэж. У.Смагін, 59 хв., ч/б, кіно;
— «Ваўчыная зграя» (1975), рэж. Б.Сьцяпанаў, 85 хв., ч/б, кіно;
— «Доўгія вёрсты вайны» (1975), рэж. А.Карпаў, 205 хв., ч/б, кіно;
— «Узыходжаньне» (1976), рэж. Л.Шапіцько, 105 хв., ч/б, відэа;
— «Фруза» (1981), рэж. У.Нікіфараў, 87 хв., кіно;
— «Знак бяды» (1986), рэж. М.Пташук, 151 хв., кіно / відэа;
— «Круглянскі мост» (1989), рэж. А.Мароз, 81 хв., кіно;
— «Яго батальён» (1989), рэж. А.Карпаў–ст., 137 хв., кіно;
— «Пайсьці і не вярнуцца» (1992), рэж. М.Князеў, 73 хв., кіно;
— «На Чорных лядах» (1995), рэж. У.Панамароў, 70 хв., кіно.
**Якуб Колас:**
— «Першыя выпрабаваньні» (паводле трылёгіі «На ростанях») (1960/61), рэж. У.Корш–Саблін, 186 хв., ч/б, кіно;
— «Малады дубок» (1980), рэж. У.Колас, 26 хв., кіно.
**Уладзімер Караткевіч:**
— «Жыцьцё і ўзьнясеньне Юрася Братчыка» (паводле раману «Хрыстос прызямліўся ў Гародні») (1967), рэж. У.Бычкоў, 84 хв., кіно;
— «Дзікае паляваньне караля Стаха» (1979), рэж. У.Рубінчык, 134 хв., кіно;
— «Чорны замак Альшанскі» (1983), рэж. М.Пташук, 133 хв., кіно / відэа;
— «Маці Ўрагану» (1990), рэж. Ю.Марухін, 102 хв., кіно;
— «Сівая легенда» (1991), рэж. Б.Парэмба, 109 хв., кіно.
**Кандрат Крапіва:**
— «Хто сьмяецца апошнім» (1954), рэж. У.Корш–Саблін, 98 хв., ч/б, кіно.
**Янка Купала:**
— «Паўлінка» (1952), рэж. А.Зархі, 81 хв., ч/б, кіно;
— «Раскіданае гняздо» (1981), рэж. Б.Луцэнка, 77 хв., кіно;
— «Тутэйшыя» (1993), рэж. У.Панамароў, 133 хв., кіно.
**Міхась Лынькоў:**
— «Міколка–паравоз» (1956), рэж. Л.Голуб, 94 хв., ч/б, кіно / відэа.
**Янка Маўр:**
— «Палескія рабінзоны» (1934), рэж. І.Бахар, Л.Маўчанаў, 65 хв., ч/б, кіно;
— «Неадкрытыя выспы» (1974), рэж. Л.Мартынюк, 66 хв., кіно.
**Андрэй Макаёнак:**
— «Рагаты бастыён» (1964), рэж. П.Васілеўскі, 79 хв., кіно.
**Іван Мележ:**
— «Людзі на балоце» (1981), 153 хв.; «Апейка» (1982), 79 хв.; «Подых навальніцы» (1982), 142 хв.,: «Блізкае і далёкае» (1984), 68 хв., рэж. У.Тураў, кіно.
**Міхась Чарот:**
— «Лясная быль» (1926), рэж. Ю.Тарыч, 74 хв., ч/б, кіно.
**Іван Шамякін:**
— «Крыніцы» (1964), рэж. І.Шульман, 90 хв., ч/б, кіно;
— «Хлеб пахне порахам» (паводле аповесьці «Эшалён у Нямеччыну») (1972), рэж. У.Нікіфараў, 94 хв., ч/б, кіно;
— «Гандлярка і паэт» (1978), рэж. З.Самсонаў, 93 хв., відэа;
— «Вазьму твой боль» (1980), рэж. М.Пташук, 86 хв., кіно;
— «Вясельная ноч» (паводле аповесьці «Шлюбная ноч») (1980), рэж. А.Карпаў, 67 хв., кіно.

а таксама:

— «Рудабельская рэспубліка» (пав. аповесьці **С.Грахоўскага**) (1971), рэж. М.Калінін, 98 хв., кіно;
— «Літары на мармуры» (пав. апавяданьня **У.Казько**) (1980), рэж. У.Скарабагатаў, 35 хв., кіно;
— «Траянскі конь» (пав. п'есы **М.Матукоўскага** «Амністыя») (1980), рэж. У.Панамароў, 128 хв.;
— «Радаўніца» (пав. аповесьці **А.Кудраўца**) (1984), рэж. Ю.Марухін, 77 хв., кіно;
— «Глядзіце на траву» (пав. **Я.Брыля**) (1984), рэж. У.Пазднякоў, У.Чацьверыкоў, 66 хв., кіно;
— «Сьведка» (пав. аповесьці **У.Казько**) (1985), рэж. У.Рыбараў, 160 хв., кіно;
— «Восеньскія сны» (пав. п'есы **А.Дударава** «Вечар») (1987), рэж. І.Дабралюбаў, 84 хв., кіно;
— «Пушча» (пав. раману **У.Карамазава**) (1987), рэж. У.Ворагаў, 134 хв., кіно;
— «Гамункулюс» (пав. аповесьці **В.Іпатавай** «Вузельчык Сьвятагора») (1988), рэж. А.Карпаў–мал., 97 хв., кіно;
— «Мудрамер» (пав. п'есы **М.Матукоўскага**) (1988), рэж. У.Панамароў, 135 хв., кіно;
— «На чыгунцы» (пав. апавяданьняў **М.Зарэцкага**) (1988), рэж. У.Дзяругін, 47 хв., кіно;
— «Плач перапёлкі» (пав. раману **І.Чыгрынава**) (1990), рэж. І.Дабралюбаў, 612 хв., кіно;
— «Ноч пры дарозе» (пав. апавяданьняў **К.Чорнага** і **М.Гарэцкага**) (1991), рэж. У.Шувагін, 66 хв., кіно;
— «Ятрынская вядзьмарка» (пав. п'есы **У.Адамчыка** «Раіса Грамыка») (1991), рэж. Б.Шадурскі, 103 хв., кіно.

## Фільмы па гісторыі Беларусі:

### Разьдзел «Гісторыя Беларусі ў тварах»

— «Кастусь Каліноўскі» (1927), рэж. У.Гардзін, 70 хв., ч/б, кіно;
— «Канстанцін Заслонаў» (1948), рэж. А.Файнцымер, У.Корш–Саблін, 75/71 хв., ч/б, кіно/відэа;
— «Я, Францыск Скарына...» (1969), рэж. Б.Сьцяпанаў, 98 хв., ч/б, кіно;
— «Бацька» (пра Міная Шмырова) (1971), рэж. Б.Сцяпанаў, 89 хв., кіно / відэа;
— «Магіла льва» (пав. легенды пра Машэку) (1971), рэж. У.Рубінчык, 75 хв., кіно;
— «Крыж міласэрнасьці» (пра лёс А.Пашкевіч (Цёткі) (1991), рэж. Д.Ніжнікоўская, 330 хв., кіно;
— «...Азъ воздамъ» (пра К.Лышчынскага) (1992), рэж. Б.Сьцяпанаў, 158 хв., кіно;
— «Птушкі бяз гнёздаў» (пра Л.Геніюш) (1996), рэж. У.Дудзін, 86 хв., кіно.

### Разьдзел «Варункі гісторыі нашай» (тэматычныя праграмы):

Пра **Кастуся Каліноўскага:**
— «Кастусь Каліноўскі. Супрацьстаяньне» (1987), рэж. І.Шышоў, 10 хв. (дак.);
— «Жыў у волі» (1997), рэж. С.Пятроўскі, 20 хв., кіно (дак.);
— «Кастусь Каліноўскі» (1927), рэж. У.Гардзін, 70 хв., ч/б, кіно.
Пра **Францыска Скарыну:**
— «Загадка Францыска Скарыны» (1973), рэж. Я.Колас, 10 хв., ч/б, кіно (дак.);
— «Францыск, сын Скарыны» (1989), рэж. С.Гайдук, 60 хв., кіно (дак.);
— «Я, Францыск Скарына...» (1969), рэж. Б.Сьцяпанаў, 98 хв., ч/б, кіно.
Пра **Слуцкае паўстаньне**:
— «Рэха збройнага чыну» (1992), рэж.С.Гайдук, 20 хв., кіно (дак.);
— «На Чорных лядах» (1995), рэж. У.Панамароў, 70 хв., ч/б, кіно.

Музэй гісторыі кіно знаходзіцца ля Чырвонага касьцёлу па адрасе Сьвярдлова, 4. Фільмы можна папярэдне замовіць па тэлефоне (017) 227–10–75. Для асобных гледачоў і групаў да 10 чалавек — паказ на тэлеэкране. Для групаў болей за 10 чалавек — паказ на кінаэкране праз відэапраектар.

**Падрыхтаваў Андрэй Расінскі**

# pARTisan №6




Выйшаў новы нумар альманаху сучаснае беларускае культуры pARTisan.

Тэма нумару – вёска.

Альманах можна набыць у галерэі Падземка (пр. Незалежнасьці 43), на кніжным кірмашы (Я. Купалы 27, павільён B), у шапіку CD/DVD у пераходзе на пл. Перамогі (выхад Том Тэйлар), у кніжным кіёску галоўнага будынку Акадэміі Навук. Таксама альманах можна замовіць праз інтэрнэт: www.knihi.net.

Каб атрымліваць кожны наступны нумар альманаху pARTisan, тэлефануйце: (029) 653–48–38 (Артур Клінаў), 619–80–53 (Аля Сідаровіч) ці пішыце на e–mail: arturklinov@yahoo.de, alja.sidarovicz@gmail.com

# «Дзікае паляваньне» 1863 году

Гісторыі з Гарадзенскага гістарычнага архіву. Піша **Алесь Чобат.**

## Станіслаў Манюшка і расейская паліцыя

Летам 1851 г. расейскі губэрнатар у Менску паведаміў сваім калегам зь Вільні і Горадні, што да яго зьвярнуўся па дазвол наведаць курорт Друскенікі «сын памешчыка Менскай губэрні і арганіст менскага касьцёлу шляхціц Станіслаў Манюшка» і што разам з выдадзеным дазволам пастаўлены гэты Манюшка «пад негалосны нагляд паліцыі».

У «пяці беларускіх губэрнях» Расейскай імпэрыі дзейнічала «палажэньне 1837 году», згодна зь якім нават шляхціц мог езьдзіць свабодна толькі ў межах свае губэрні, а далей патрабавалася «падарожная» — і допуск, і пропуск, і віза, і камандзіроўка, і ўсё разам…

У Вільні, як даносіў тамтэйшы паліцмайстар, Манюшка прабыў толькі дзень — і ўвесь дзень у касьцёле сьвятога Станіслава, дзе гаварыў з арганістам і сам паўдня граў на аргане.

У саміх Друскеніках Манюшка дзён дзесяць хадзіў піць мінэральную ваду, і нават наняў пакой у пансіянаце доктара Рэніера, заснавальніка курорту. Мясцовы пастарунак «з вахмістра і чатырох жандараў» ня меў з Манюшкам асаблівай работы, бо з Друскенікаў той нідзе не ўцякаў, адно схадзіў у бліжні лес на могілкі і ўсклаў белыя і чырвоныя ружы на магілу «былога ссыльнага» Яна Чачота. Пасьля чаго той самай дарогай вярнуўся ў Менск. Як прыйшлі сьледам паліцэйскія рапарты, менскі губэрнатар распарадзіўся «негалосны нагляд» зьняць, а «справу» закрыць.

Чым просты арганіст так зацікавіў ажно траіх расейскіх губэрнатараў?! А проста тое ж «палажэньне 1837 г.» ясна загадвала, што пад «негалосны нагляд» аўтаматычна трапляюць вось якія катэгорыі чалавечага роду: усе палякі, хто хоць бы год правучыўся ў Віленскай мэдычнай акадэміі ці ў Кіеўскім унівэрсытэце (туды быў «пераведзены» Віленскі ўнівэрсытэт, пасьля разгрому 1832 г.); усе… інжынэры-чыгуначнікі; усе наведнікі курорту Друскенікі, на мяжы занёманскага Каралеўства Польскага; нарэшце, усе падпісчыкі якіх-кольвек газэтаў і часопісаў, няхай бы гэта былі афі-



**Станіслаў Манюшка.**

цыйныя «ведамасьці» якой-небудзь губэрні…

Цікава, як расейская паліцыя зь яе малым штатам спраўлялася зь дзясяткамі тысячаў шляхты, і колькі сярод той шляхты было паліцэйскай агентуры?!

Такі парадак дзейнічаў да 1867 г. — і пад яго трапіў нейкі інжынэр-чыгуначнік Браніслаў Шварцэ, «французкападданы», які наняўся на будову лініі Санкт-Пецярбург-Вільня-Варшава, а перад паўстаньнем 1863 г. рабіў на падпольны Жонд і перавозіў зброю для брыгадаў Серакоўскага, Аскеркі, Лянкевіча і Нарбута. А між іншым, і друкарню з запасам паперы — потым яе напаўсамавольна прысабечыў Каліноўскі, і так нарадзілася «Мужыцкая Праўда»… Спраўны быў «пад негалосным наглядам» той Браніслаў Антон Шварцэ — а шчыльнасьць «нагляду» відаць хоць бы са «справы» Манюшкі! Бо ж сам камбінаваў і грошы плаціў сваім сьлесарам і машыністам, а тыя бралі, рабілі і ня бегалі па паліцыю. Калі ёсьць людзі і грошы, тады канспірацыя лішняя, а дзе няма канспірацыі, там няма здрады з правуламі…

## Эліза Ажэшка і яе «Пінская шляхта»

Вясной 1859 г. гарадзенскі губэрнатар быў у Санкт-Пецярбургу па службовых справах і раптам збаламуціў тэлеграмай свайго шэфа, генэрал-губэрнатара ў Вільні (да Горадні тэлеграф яшчэ не дацягнулі), каб «асабіста, тэрмінова, адразу ж!» паслаць афіцэра зь віншаваньнямі ў маёнтак Людвінава Пінскага павету, да губэрнскага маршалка шляхты Калікста Ажэшкі: імпэратар Аляксандар II «падараваў» маршалку прыдворны чын «камэр-юнкер».

У складанай імпэрскай гіерархіі былі толькі два прыдворныя чыны, «камэргер» і «камэр-юнкер», якія мелі права хадзіць да імпэратара без дакладу, толькі паведаміўшы дзяжурнаму афіцэру, і ніхто ня меў права іх не пусьціць.- Так што пінскі шляхціц Калікст Ажэшка раптам скочыў вышэй губэрнатараў.

Але за якія такія заслугі?!

У 1858 г. Аляксандар II першы раз наведаў Вільню, ня даў «ніякіх абяцаньняў» пра Польшчу, а потым зрабіў крук у Вялікую Пушчу. І тут яго праваднікам і таварышам выступіў Калікст Ажэшка, як губэрнскі маршалак і найлепшы знаўца ў зубрах, ласях, дзіках, настойках, наліўках, шляхцянках і просталюдзінках.

Таго самага клану Антон Ажэшка ў 1831 г. быў «пад наглядам паліцыі», чытай, адседзеўся ад вайны ў сваім Людвінаве, але вось у 1838 г. яго «выслалі» ў Томск, дзе ён «пакутаваў за Польшчу»… «столаначальнікам канцылярыі» томскага губэрнатара — і вярнуўся па амністыі 1858 г., і маёнтак яго быў цэлы і на месцы. А паколькі ўвесь падпольны «саюз польскага народу», арыштаваны разам з Антонам Ажэшкам, пайшоў на шыбеніцу і катаргу, шляхта не без падставаў падазравала Ажэшку ў «здрадзе Айчыны» — і мянушку «Юдаш» прыляпіла яму навечна.

Быў яшчэ трэці, Фелікс Ажэшка, і меў трох сыноў — старэйшы Фларыян у 1861 г. скончыў у Санкт-Пецярбургу Мэдычна-хірургічную акадэмію і заадно набраўся там самі ведаеце якіх ідэяў, а два ягоныя браты Пётра і Браніслаў жылі на гаспадарцы ў сваім Пінскім павеце. У 1853 г. Пётра Ажэшка пашлюбіў беднаватую, але прыгожую Элізу Паўлоўскую з падгарадзенскай

Працяг на старонцы 24.

# «Дзікае паляваньне» 1863 году

Працяг са старонкі 23.

Мількаўшчыны, якая толькі год назад выскачыла з кляштарнага пансіёну пад Варшавай…

Паўстаньне 1863 г. рассыпала разам з другімі «клан Ажэшкаў». Фелікс памёр па арышце Фларыяна ў 1863 г. Самога Фларыяна выслалі ў Сыбір на дваццаць гадоў і ён не вярнуўся па «поўнай амністыі» 1883 г.: абжыўся, працаваў лекарам, перабраўся ў Томск. Пётра таксама быў высланы і па дарозе зьнік бязь зьвестак, а лёс Браніслава ўвогуле невядомы. Эліза Ажэшка, як толькі ў 1867 г. адмянілі «ваеннае становішча», пераехала ў Горадню, і пра яе далейшы лёс можна прачытаць у даведніках і энцыкляпэдыях.

Там няма толькі аднаго. Чаму пасьля «камэр-юнкера» і «Юдаша» ўсе свае творы — ад першага апавяданьня «Малюнак з галодных гадоў» і да перадсьмяротнага рэквіюму Gloria Victis — пані Эліза падпісвалася Orzeszkova?! Не Паўлоўская па бацьку, не Нагорская па другім мужы, інжынэры, за якім была «як за мурам каменным».

Чаму? А вось чаму. Бо клін выбіваецца клінам. Бо праз Калікста з Антонам «ажэшка» так і было тое самае, што «здраднік». А хто цяпер пра іх памятае? Адзін пыл архіваў… Адна ў сьвеце вартая памяці — Эліза Ажэшка.

Якая ў нацыі памяць, якія там імёны, такая ў нацыі будучыня, бо ж ці не Эліза Ажэшка параіла неяк у Горадні віленскаму адвакату і варшаўскаму карэспандэнту Францішку Багушэвічу: «Кінь, Франак, па-польску тэлеграмы ў газэты — пішы ты вершы па-беларуску, і ўсё будзе добра!»

## «Дзікае паляваньне» 1863 году

Калі зімой 1863 г. да ўкраінскіх сёлаў над Дняпром дакаціліся чуткі пра «польскі бунт у Варшаве», па ўсёй Кіеўскай губэрні шляхта кінула вёскі ды маёнткі і пабегла ў Кіеў — да расейскага губэрнатара і пад ахову расейскага гарнізону. А хто застаўся дома ці не дабег — тых парэзалі, а «двары» іх не палілі, як у «гайдамаччыну», але зьбіралі сельскія сходы (!), на якіх дзялілі «панскую зямлю», ставілі на ўсіх дарогах «мужыцкую самаабарону» і высылалі старастаў, а нават з праваслаўнымі бацюшкамі ў той



Эліза Ажэшка.

самы Кіеў да таго ж расейскага губэрнатара, якому падавалі прынятыя на сходах «унівэрсалы», дзе дабіваліся «Цара, зямлі, волі — і ніякіх паноў!»

Становішча склалася настолькі неверагоднае, што кіеўскі генэрал-губэрнатар зайшоў у такі тупік, як ніхто дагэтуль у Расейскай імпэрыі. А сталічны Санкт-Пецярбург баяўся супрацьлеглага і патрабаваў ад губэрнатара, каб «польскі мяцеж» не перакінуўся за Дняпро, не зрабіўся «другой пугачоўшчынай», сялянскай вайной у самой Расеі, інсьпіраванай «мяцежнымі палякамі»!

Але з таго ж Санкт-Пецярбургу вясной 1863 г. прыехаў у Кіеў інкогніта жандарскі падпалкоўнік Міхайлаў, які падпарадкоўваўся толькі шэфу Корпусу жандараў князю Даўгарукаму. Незадоўга перад тым «мужыцкая самаахова» перахапіла і прывяла ў Кіеў «на вяроўцы» адстаўнога старога генэрала, які сваёй брычкай вяртаўся з курорту ў Аўстрыі. Парадокс быў у тым, што «сяло» лічыла палякамі ўсіх, хто не ў мужыцкіх сьвітках і не ў расейскай вайсковай форме, — вось куды зайшла нянавісьць да «польскага пана». А ўвесь ідыятызм становішча быў у тым, што цяпер губэрнатар меў бараніць тых «сяброў па клясе» і пасылаць на «сяло» карныя пацыфікацыі расейскага войска!

Трэба аддаць належнае падпалкоўніку Міхайлаву — знайшоў ён выйсце. Падпалкоўнік прапанаваў прыслаць у Кіеў жандарскі «спэцназ», 15—20 афіцэраў з вопытам каўкаскай вайны, каб «зьняць з абароту» мужыцкіх крыкуноў і завадатараў. Але ня проста так, а «з улікам мясцовых казаньняў і ілжывых вераваньняў, прыклады якіх мною сабраныя па кожнай воласьці!»

Мне адразу рэзнула з памяці, калі чытаў гэтую «справу» ў архіве, жабрачка зь «Дзікага паляваньня караля Стаха»: «Мы стаялі, крычалі… а ноччу прыйшло дзікае паляваньне і забрала мне мужыка, і ўсіх забралі, а нас выгналі з хаты»… Такіх «паляваньняў» у сярэдзіне XIX ст. у адной Кіеўскай губэрні разьвялося больш, чым бывала ў свой час ва ўсіх замках сярэднявечнай Эўропы. Так што падпалкоўнік Міхайлаў добра ведаў пра той «праваслаўны хрысьціянскі народ», што праваслаўны ён толькі на сьвяты, хрост, шлюб і жалобу, а насамрэч жыве ў сваёй веры, у «дзікім паляваньні, і толькі яго баіцца».

Праз месяц падпалкоўнік даклаў Даўгарукаву, што «бунт расьсеяўся, як і ўзьнік», і тыя дваццаць афіцэраў могуць ехаць назад па крыжы і мэдалі…

Караткевіч у сваёй геніяльнай аповесьці проста лёгка пасунуў час, месца і дзеючых асобаў — замест 1863-га сталі 90-я гады XIX ст., замест Кіеўскай губэрні — такі ж глухмень Менскай, а замест «спэцназу» — засьцянковая шляхта. Каб ведаць «сапраўдную, а ня кніжную» гісторыю, найлепш чытаць «рамантыка» Караткевіча — там ніводнай выдуманай дэталі. Самае важнае ў гісторыі — гэта «дэталі», бо там праўда, якой ня выдумаеш. Усё астатняе — гэта і ёсьць выдумкі — нацыянальныя, сацыяльныя, палітычныя сродкі школьнага выхаваньня і гадоўлі чалавечага роду дзеля нейкіх чарговых «вялікіх ідэяў і мэтаў».

## Граф Мураўёў і царкоўныя грошы

Летам 1864 г., калі выйшаў царскі маніфэст пра «сканчэньне польскага мецяжу», віленскі генэрал-губэрнатар, генэрал ад інфантэрыі і граф Міхаіл Мураўёў з уласных сродкаў зафундаваў адзін мільён рублёў на пабудову мураваных — каб ня горш касьцёлаў! — цэркваў «у Заходнім Краі» з мэтай, ясная справа, яго «русіфікацыі» і ў далейшым «расейскай каланізацыі». На той час адна мураваная царква, ад праекту і да першай службы, каштавала дваццаць тысячаў рублёў. «Фонд Мураўёва» меў збудаваць пяцьдзясят такіх цэркваў.

Пакуль Мураўёў меў паўнамоцтвы дыктатара і пакуль дзейнічала ваеннае становішча, будаўніцтва пасоўвалася «звыш чаканьняў» — напрыклад, палкоўнік Ян Барэйша са сваім пяхотным палком за адно лета (!) паставіў муравааны храм у мястэчку Гарадок (Бельскі павет), які там стаіць па сёньняшні дзень. Але потым сталічныя інтрыгі «прапольскай партыі» расейскай арыстакратыі, на чале якой быў пецярбурскі генэрал-губэрнатар Аляксандар Сувораў (унук, дарэчы, — гэта ён начапіў на Мураўёва мянушку «Вешальнік»), скончыліся тым, што Мураўёва з 1 студзеня 1866 г. выперлі ў адстаўку, і ўсё «царкоўнае будаўніцтва ў Заходнім краі» імгненна заглухла.

Сьледам за Гарадком, мураваная царква мела паўстаць у суседнім мястэчку Крынкі — і калі толькі граф ажыў пасьля чорнай несправядлівасьці за верную службу, ён адразу пацікавіўся будаўніцтвам у Крынках: і дзе гэты мільён з «фонду Мураўёва» ўвогуле?

Адказ прыйшоў без канцылярскай валакіты: «Якія грошы ў выпадку беспарадкаў (!) і па памылцы прылічаныя былі да іншых часовых збораў і паступленьняў і пералічаныя ў Віленскае губэрнскае кіраваньне міністэрства фінансаў».

«Нацыяналізавалі» «фонд Мураўёва» пацукі канцылярскія, найхутчэй, каб заткнуць дзірку сваіх уласных крадзежаў…

Граф паскардзіўся пляменьніку, а цяпер генэрал-губэрнатару ў Вільні генэралу Каўфману — тут канцылярыя спрацавала імгненна, прызнала зладзействы і нават паведаміла, як сьледства рухаецца: «Узбудзіў перапіску»…




**Тагачасная карыкатура на Міхаіла Мураўёва.**

Граф не здаваўся. Пайшоў пісаць трэцім і пятым разам — і атрымаў годны сябе (і ўсяе Расейскае імпэрыі) адказ: «Паколькі грошай ужо няма, то знайсьці іх не падаецца магчымым».

Савецкія і пасавецкія канцылярскія пацукі і злодзеі — гэта жалю вартыя эпігоны і графаманы ў параўнаньні з сапраўднай канцылярыяй — імпэрскай, вялікадзяржаўнай, вечнай…

Так «памерлі ненароджанымі» дзясяткі мураваных праваслаўных цэркваў на Беласточчыне, Гарадзеншчыне, Віленшчыне і Меншчыне, а 29 жніўня 1866 г. «праз такую перапіску» памёр сам граф М.Мураўёў, па мянушцы «Вешальнік». Вось такі эпілёг і такая эпітафія. Служы Расеі — і атрымаеш па-расейску…

А тыя цэрквы на Беларусі, якія цяпер называюць «мураўёўкамі», паўсталі значна пазьней, на пераломе XIX-XX ст. — коштам ужо дзяржаўнага бюджэту.

**Ад Рэдакцыі:** А той мураўёўскі мільён быў з грошай, рэквізаваных у беларускіх паўстанцаў.

## НОВЫЯ КНІГІ ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

# Польскія публікацыі крыніцаў па гісторыі Беларусі

**Akty cechów wileńskich 1495—1759.** Zebrał i przygotował do druku Henryk Łowmiański przy współudziale Marii Łowmiańskiej i Stanisława Kościałkowskiego. Przedmową i skorowidzami opatrzył Jan Jurkiewicz. — Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 2006. — ŐÑ + 493 + 320 s.

**Акты віленскіх цэхаў 1495—1759.** Сабраў і падрыхтаваў да друку Генрык Лаўмяньскі пры ўдзеле Марыі Лаўмяньскай і Станіслава Касьцялкоўскага. Прадмову і паказальнікі падрыхтаваў Ян Юркевіч. — Познань: Выдавецтва Познанскае, 2006. — 320 ст.

Кніга ўтрымлівае тэксты крыніцаў, сабраных і падрыхтаваных да друку ў міжваеннай Вільні, публікацыя якіх была перарваная у 1939 г. Другой усясьветнай вайны. З заплянаванага двухтамовіка быў надрукаваны першы том і значная частка другога. Але і з тых тамоў захавалася няшмат асобнікаў — бяз вокладкі, тытульнай старонкі, без паказальнікаў. У Вільні і сёньня распавядаюць, як у паваенны час асобнікі гэтай кнігі ўратаваў ад зьнішчэньня тагачасны дырэктар Бібліятэкі Акадэміі навук Літвы праф. Юозас Юргініс. Але і сам укладальнік падчас выезду ў Польшчу здолеў захаваць некалькі асобнікаў уласнага выданьня. Праф. Лаўмяньскі стаў у Познані заснавальнікам новай гістарыяграфічнай школы вывучэньня ВКЛ (гл. падрабязьней «Спадчына прафэсара Лаўмяньскага», НН, 18.08.2006). Таму ня дзіўна, што цяпер менавіта ў Познані вучнямі праф. Лаўмяньскага тое даўняе выданьне было аднаўленае і дапоўненае — паказальнікамі і іншым адпаведным даведачным апаратам.

Старонкі гарадзкой цывілізацыі Вялікага Княства ажываюць на старонках дакумэнтаў. Жыцьця каляровага, кантраснага, скваапнага, напружанага, велікадушнага, рытуальнага. Высьвятляецца, што шмат якія мэнтальныя рэаліі тае эпохі засталіся і ў нашым жыцьці.

**Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego.** T. I: Okresy bezkrólewi (1572—1576, 1586—1587, 1632, 1648, 1696—1697, 1706—1709, 1733—1735, 1763—1764). Opracował Henryk Lulewicz. — Warszawa: Wydawnictwo Neriton — Instytut Historii PAN, 2006. — 437 s.

**Акты зьездаў станаў Вялікага Княства Літоўскага.** Т. I: Пэрыяды бескаралеўя (1572—1576, 1586—1587, 1632, 1648, 1696—1697, 1706—1709, 1733—1735, 1763—1764). Апрацаваў Генрык Люлевіч. — Варшава: Выдавецтва Neriton — Інстытут гісторыі Польскай Акадэміі навук, 2006. — 437 с.

Том укладзены з тэкстаў такой спэцыфічнай для ВКЛ пасьля Люблінскай уніі інстытуцыі, як Зьезд станаў. Рэч у тым, што, паводле ўніўнае дамовы, ужо ня мог зьбірацца Вальны сойм Вялікага Княства. Адзіным прадстаўніча-заканадаўчым органам станаў супольны Сойм Рэчы Паспалітае. Але ў выніку крызісу бескаралеўяў, які наступіў хутка пасьля Любліна, нарадзілася своеасаблівая інстытуцыя — заменьнік Вальных соймаў ВКЛ — Зьезд станаў ВКЛ. Гэты орган стаў неабходным для прыняцьця рашэньняў, жыцьцёва важных для ўсяго грамадзтва Вялікага Княства ў варунках адсутнасьці легітымнай цэнтральнай улады канфэдэрацыі.

**Алег Дзярновіч**

# Савецкая Беларусь на ўсходзе Украіны



**Дом марыупальскай культуры, аздоблены мясцовым мастаком.**

**Працяг са старонкі 16.**

таксама маляўнічыя ўзгоркі на беразе мора. Паводле мясцовай легенды, на адным зь іх Аляксандар Пушкін пісаў казку «Пра рыбака і рыбку». Нават помнік мерацца ўсталяваць.

## Мора-балота

«Ажно зь Беларусі? І варта было ехаць у такую далячынь дзеля нашага балота?» — дзівіцца цётка, у якой мы хочам арандаваць пакой. «Мора тут нецікавае — гарачае, неглыбокае, асьвяжыцца толкам немагчыма», — наракае загадчыца мясцовае турбазы. Мора ж, сапраўды, вельмі цёплае, неглыбокае, пры беразе ногі трохі грузнуць у глеі, які лічыцца вельмі карысным. Тут можна прайсьці паўкіляметра ад берагу і не схавацца па пояс у вадзе.

Азоўскае мора самае неглыбокае ў сьвеце — максымальная глыбіня трохі перасягае 14 м. Вада на 5 градусаў цяплей, як у Крыме. Яна добра трымае на паверхні, хоць амаль несалёная, праз што ў гарачыню яе з ахвотай п’юць сабакі. Высокія хвалі тут нячастыя госьці. Усё разам гэта робіць мясцовыя курорты асабліва прывабнымі для сем’яў з малымі дзеткамі ды пэнсіянэраў. Апошнія часта любяць нагадваць: каб ня мора зь яго глеем ды гарачае паветра, даўно б парылі яны зямельку. Таму хутка перастаюць дзівіць сталыя дзядзькі, а то й бабулі, з галавы да ног перапэцканыя ў тарфянога колеру глей.

## Рэшта цукеркамі

Асартымэнт пасялковых крамак дазваляе правесьці адпачынак без вылазак у горад. Тут працуе прынцып — чым далей ад мора, тым таньней. У цэлым кошты параўнальныя зь беларускімі. Можна ўволю паласавацца таньнейшым, як у нас, печывам, марозівам ды садавінай, аматараў піва пацешыць багацьце асартымэнту й адносная недарагавізна ўкраінскага пеннага напою. Можна пабачыць прадукцыю берасьцейскага «Санта Брэмар», хоць прысутнасьць яе ў старым рыбацкім паселішчы ў першую чаргу дзівіць, а ўжо пасьля выклікае пачуцьцё гонару.

Вады з-пад крану тут ніхто ня п’е, бо яна гарчэйшая, чым у моры. Па пітную ваду ідуць у краму, дзе яе прадаюць у пляшках, пакетах ды на разьліў. У самым скрайнім выпадку ваду бяруць у калодзежы.

Дзяржаўны гандаль адсутнічае, а

яго занядбаныя будынкі займае ўсюдыісны «Ільіч».

На мясцовым кірмашы нам прапаноўваюць харч, вопратку, посуд, касмэтыку ды гігіенічныя сродкі, а таксама прэсу — спрэс «жоўтую». Найперш цікавімся таннай садавіной і рыбай. Ад апошняй гандляркі безь перадыху ганяюць мухаў. Тыя лятуць на печыва, якое ніхто не ахоўвае. Ад гэтага здаля падаецца, што ўсе гатункі печыва тут з разынкамі.

У адной з крамак прадавачка выдала рэшту цукеркамі-шыпучкамі, па 10 капеек за кожную. Папярэдзіла — захоўвайце да наступнага візыту, калі што — разьлічымся.

Пры кожнай краме знаходзіцца імправізаваная альтанка, дзе ўдзень можна перачакаць гарачыню, а ўвечары падсілкавацца шашлыком, піццай ды варанымі ракамі. Або смачным украінскім баршчом ды адбіўнымі, якія прыгатуюць тут жа, пры кліенту.

## Эстафета культуры і труда

Калі вы маеце на мэце адпачыць ня толькі фізычна, але й на колькі тыдняў забыцца на нашую рэчаіснасьць, цалкам увасобіць гэтае жаданьне на ўсходзе Ўкраіны не атрымаецца. Мясцовыя жыхары ў большасьці размаўляюць па-расейску ці на трасянцы. Свае грошы называюць ня грыўнамі, а рублямі. Шыльды з назвамі вуліцаў часьцяком напісаныя на расейскай мове, як і ладная частка рэкламы. Па-ўкраінску афармленыя бігборды з прэзыдэнтам Юшчанкам, які заклікае адмяніць дэпутацкую недатыкальнасьць, а таксама з рэклямай Samsung. Зусім як у нас у глянцавых часопісах на роднай мове рэклямуецца прадукцыя Bosch ды той жа Samsung.

Над праспэктам Мэталюргаў у Марыупалі расьцяжка ў савецкім стылі ўслаўляе чалавека працы, а ў Шырокіне ад рукі намаляваная афіша запрашае паўдзельнічаць у «эстафэце культуры і труда». Пэнсіянэры ганяць свайго прэзыдэнта і моляцца на нашага, які й калхозы не разагнаў, і парадак у краіне навёў. Пры гэтым старыя езьдзяць у бясплатных аўтобусах, ды маюць ільготы на гарадзкі транспарт.



## «Была я ў Беларусі, у Грозным...»

Нашая гаспадыня неяк увечары перахапіла нас на парозе, пасадзіла на лаву ды пачала распытваць пра Беларусь ды Менск. «Была я ў вас некалі, рыбу зь семкамі ды алеем прадавала. Памятаю, мяжу перасякалі ці то ў Гомелі, ці не, у Грозным...» — дзеліцца ўспамінамі кабета. Пра падзеі ў Беларусі тут ведаюць мала. Лукашэнка па-ранейшаму наш самы вядомы брэнд. Але ня ўсе да яго ставяцца адназначна прыязна — жанчына ў цягніку ў часе адной такой размовы ўзгадвае Сталіна ды рэпрэсіі.

## Толькі мы самыя

У бюлетэні, прысьвечаным пэрспэктывам самакіраваньня, вычытаў, што дзякуючы высілкам мясцовай улады Марыупаль атрымае больш за чатырыста сьмецьцевых кантэйнэраў ды спэцтэхніку. Вываз сьмецьця — надзвычай балючае пытаньне як для гораду, так і для навакольных паселішчаў. Гэта адзін з істотных мінусаў, што моцна адбіваецца на стане турызму.




Сьмецьце раскіданае паўсюль — на вуліцах, пляжах. На высокай туі побач з пасялковым клюбам ад Новага году матляюцца выгарэлыя ўпрыгожаньні. Пытаньне ня столькі ў адсутнасьці сьметніцаў, як у культуры месьцічаў. Маладзён на вакзале кідае недапалак побач з пустой сьметніцай, тут жа сталыя кабеты лузгаюць семкі пад ногі. «Мы звыклі да таго, што нам нехта павінен усё зрабіць — адрамантаваць дарогу, усталяваць сьметніцу. Гэты нехта — дзяржава, улады, ці ўласьнік крамы, але толькі ня мы самыя. Але парадак павінен наступіць у нашых галовах, толькі мы самыя, арганізаваўшыся, здольныя зьмяніць нашае жыцьцё, зрабіць яго больш утульным», — піша прыхільнік самакіраваньня ў бюлетэні.

Аднак, як бы не палохалі горы сьмецьця навокал, мора і навакольныя краявіды, гасьцінныя людзі кампэнсуюць усё. Пакідаючы гэтае ласкавае мора-балота, ці хутчэй мора-возера, застаесься пры сваёй адвечнай зайздрасьці да жыхароў краёў, якіх лёс надзяліў морамі ды горамі.

**Фота аўтара**

# Капітан Танака - ганчар



Неяк Капітан Танака вырашыў папрацаваць ганчаром. Спачатку ён накапаў рыдлёўкай гліны.



Потым Танака наклаў гліны ў вазок. Гліна была сухая і цяжкая, нібы камяні.



Пасьля Танака заліў гліну вадой, каб яна размокла і зрабілася мяккай.



Вільготную гліну давялося добра разьмяшаць.



Танака круціць ганчарнае кола. Камячок гліны пакрысе пачаў ператварацца ў гаршчок.



Потым Танака
паставіў сыры
гаршчок у
адмысловую печ.







Гаршчок абпальваецца,
Танака цярпліва чакае,
паглядаючы на гадзіньнік.
У печцы вельмі горача!

Абпалены гаршчок зрабіўся цьвёрдым.
Цяпер яго можна размаляваць фарбай.



Нарэшце гаршчок гатовы!
А як ты думаеш, для чаго
яго можа выкарыстаць Капітан Танака?
Можа быць, для таго,
каб наліць у яго малако?
Ці каб трымаць у гаршчку мёд?
А, магчыма, проста паставіць у яго
букет кветак?

Капітан Танака ©

http://www.tanakaland.org



16 жніўня а 15-й на сайце «Тузін гітоў» падведзеныя вынікі гадавога гіт-параду. Найлепшыя песьні вызначаліся галасаваньнем слухачоў у інтэрнэце. Найбольш галасоў (1154) набрала песьня N.R.M. «Менск і Мінск».

Цікава, што і на трэцім месцы — песьня пра Менск. Гэта «Схаванае сэрца»гурту «IQ48» на словы Міхала Анэмпадыстава. Дванаццаць найлепшых песень году, вызначаных слухачамі «Тузіну», выйдуць асобным дыскам.

## ЛЯВОН ВОЛЬСКІ

### МЕНСК І МІНСК

Дарагія мінчане і госьці сталіцы,
Я хачу з вамі болем сваім падзяліцца.
Карацей, гэта брыдка, але сэ ля ві,
Мы ў сталіцы жывем нібы на дзьве сям'і.

Мы жывем адначасова ў двух гарадах,
Падваеньне асобы зрывае нам дах,
Гэты факт паступова зрывае нам дах,
Дык няўжо ж нам ніколі ня склеіць, ня сшыць
Менск і Мінск — дзьве паловы сталічнай душы.

Першы горад, які называецца Менск,
Не убачыш на мапах, у гэтым і сэнс,
Ён у сэрцы жыве, ён жыве ў галаве,
Шмат таго, хто у горадзе Мінску жыве,
А ў Мінску прапіска і гарвыканкам,
І Лядовы палац, і бэтонны паркан,
І дзяцінства майго прамільгнулыя дні,
Зруйнаваных дамоў сьцены прывідныя.

Ёсьць у Мінску назовы бязрадасныя,
Ёсьць Калектарная, а ёсьць Базісная
Там народ забясьпечвае, правільны наш,
Выкананьне задачы пастаўленае.

А па Менску прыемна шпацыраваць,
Дробных крамак вітрыны ўтульна гараць,
Там сьпічастыя вежы касьцёлаў старых,
І дахоўка на стрэхах, двары і муры.

Усё блытаецца ў Мінску: хлеб і маца,
І Вялікі Кастрычнік, і Радаўніца,
І п'яная сьляза, і такая папса,
Што ратунку ня дасьць ні «Мізім», ні «Упса».

Ну а зь Менскам нічога ня можна зрабіць,
Немагчыма яго зруйнаваць, захапіць,
Ён ніколі, твой Менск, не памрэ, не згарыць,
Будзе мовай тваёю з табой гаварыць.

Мы жывем адначасова ў двух гарадах,
Падваеньне асобы зрывае нам дах,
Гэты факт паступова зрывае нам дах,
Дык няўжо ж нам ніколі ня склеіць, ня сшыць
Менск і Мінск — дзьве паловы сталічнай душы.



**У 2007 годзе, годзе 125-годзьдзя Купалы і Коласа, «НН» штонумар друкуе творы беларускіх паэтаў. У ранейшых нумарах пабачылі сьвет творы Генадзя Бураўкіна, Андруся Храпавіцкага, Юрася Пацюпы, Міхала Анемпадыстава, Сяргея Прылуцкага, Сяргея Сыса, Алеся Макрацова ды іншых аўтараў. Чакаем Вашых твораў.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Выстава фатографа «НН»

**У менскай артхаўс-галерэі «Падземка»** (пр.Незалежнасьці, 43) да канца месяца працуе фотавыстава **Андрэя Лянкевіча «Living with Art» («Жыцьцё з мастацтвам»)**. Сэрыя прысьвечаная карцінам вядомага аўстрыйскага мастака Аляксандра Вальтнэра, што трапілі ў прыватныя калекцыі мільянэраў. Каб перадаць жыцьцё карцін праз іх гаспадароў, Лянкевіч наведаўся ў лепшыя дамы Аўстрыі. Ён кажа, што там назіраў, як карціны і людзі ўзаемадзейнічаюць у прыватным, хатнім жыцьці.

## ВЫСТАВА

### Менск. Партрэты

**У мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва** (пр.Ракасоўкага, 49) працуе **фотавыстава Джэфа Баніфасіно «Менск. Партрэты»**. Людзі культуры і мастацтва вачыма францускага фатографа.

## ФЭСТЫВАЛЬ

### Navinki

**З 1 да 2 верасьня ў Палацы мастацтва** (Казлова, 3) у 9–ы раз пройдзе **міжнародны фэстываль пэрфомансу «Navinki»**. Трэці дзень фэсту (3 верасьня) па традыцыі адбудзецца на возеры Вяча пад Менскам.

## КАНЦЭРТЫ

### :B:N на радзіме

**24 жніўня ў Бярозаўскім ДК рок-гурт :B:N** зьбірае землякоў.

Зайграюць **«Мясцовыя», «Кальмары», «Мамант». Пачатак канцэрту а 19-й.** Квіткі: 2000 рублёў.

### Адзіны канцэрт Андрэя Краўчанкі

**25 жніўня экс-лідэр гурта «Why Not» Андрэй Краўчанка** дасьць акустычны канцэрт. Ён жыве ў Вашынгтоне. Кожны яго выступ становіцца падзеяй для мэляманаў. **Клюб «Мілеініюм», 20:30.** Даведкіпа т.: 638–78–96.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Пэнэлёпа»

Фэмінісцкая мэлядрама са сьвіным лычом.

Пэнэлёпа (Penelope)

Вялікабрытанія — ЗША, 2006, каляровы, 101 хв.

**Рэжысэр:** Марк Паланскі

**Жанр:** Мэлядрама, казка

**Адзнака:** 5,5 (з 10)

Пэнэлёпа нарадзілася ў старажытнай арыстакратычнай сям'і. Яна прыгожая, разумная, дасьціпная — вось толькі замест носа ў яе сьвіны лыч. Сямейны праклён будзе зьняты, калі Пэнэлёпу палюбіць нехта «такі ж, як яна сама». Бацькі наладжваюць агледзіны арыстакратаў–жаніхоў, але ўсе ўцякаюць, толькі ўбачыўшы сьвіное рыла. І вось аднойчы Пэнэлёпа знаёміцца з гульцом–недарэкам…

Ангельскі палац, дзівосны пакойчык Пэнэлёпы, дзе яна хаваецца; уцёкі, горад са спакусамі, мэдыйны скандал, хэпі–энд.

«Патрыярхальны» казачны фільм упадабаюць схільныя да аўтатрэнінгу фэміністкі. Любоў, што выбаўляе ад праклёну, ня могуць даць Пэнэлёпе мужчыны. Яна мусіць палюбіць сябе сама. А мужчына, муж, палюбоўнік — так — для камплекту гераіні, якая ганарыцца сваім аблічкам і сваім «гендэрам».

**Андрэй Расінскі**



## КАЛІ Б...

**...беларускія памежнікі пачалі выкарыстоўваць ягоную тэрміналёгію. Напрыклад: «даць па мордзе».**




МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА




## «Дзікае паляваньне» 1863 году



**Гісторыі, знойдзеныя ў гарадзенскім архіве. Піша Алесь Чобат. Старонка 23.**

## КУР'ЁЗ




СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ





# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»**, проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 17.**


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПАДЗЯКІ

**Шчыры дзякуй** Алесю Мазаніку за маральную падтрымку. Алесь

### КАНТАКТЫ

**Шукаю** спадарожнікаў на адпачынак у Бодрум (Турцыя). Ад'езд 6 верасьня да 17 верасьня. Т.: 665–02–05. Вольга

**Пазнаёмлюся зь людзьмі**, якія цікавяцца беларускім паганствам. paganism@tut.by

### ПРАЦА

**Хлопец** 18 год, студэнт-завочнік, шукае сталую працу. Т.: 572–28–38, Аляксей

**Студэнт** МДЛУ шукае дадатковую працу, зьвязаную з вывучэньнем ангельскай мовы (рэпэтытарства). Т.: 709–91–07

### КНІГІ

**Абмен культуралягічнай інфармацыяй**, кнігамі. Дашлю сьпіс прапаноў. Канфэрэнцыі, літаратурныя вечарыны, выдавецкія праекты. Ад Вас — капэрта са зваротным адрасам. А/с 195, 220030, Менск. alesknigi@mail.ru

**Прапаную** набор падручнікаў па камп'ютарным праграмаваньні ў абмен на беларускамоўныя выданьні. alesknigi@mail.ru. Т.: 753–91–96

### ПРАДАМ

**Танна прадам** цагляны прыватны дом (2 узроўні, 50 кв.м.) з участкам 0,054 га, 10 хвілін хады ад менскай кальцавой. Знутры дабудаваны толькі на 35%. Падведзеныя сьвятло і вада. Ёсьць печка. Газыфікацыя — да канца 2007 г. Праз 11 месяцаў — у межах Менску! Тэлефануйце ў любы час дня й ночы: (029) 576–74–29.

**Тэрмінова прадаецца** 2-пакаёўка ў Дзяржынску. 4 паверх цаглянага 5-павярховіка (1995 г.), 47 кв.м агульнай плошчы, 27 — жылой, з кухняй 7,6 м. Зашклёны гаўбец, лічыльнікі вады і цяпла, падвал. Блізка 4 крамы, школа, прыпынак транспарту. Дзіцячы садок у двары ля пад'езду. Прыгожы краявід з вакна, недалёка возера Дзягільна. За 50.500. Т.: (029) 701–62–70, 338–10–53, (017) 205–77–48.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Судзьдзя гаворыць да абвінямых, трох вясковых хлопцаў:

— Вы абвіняецеся ў тым, што хадзілі па вёсках і сьпявалі забароненыя песьні. Прызнаеце вы сябе вінаватымі?

— Не, не прызнаём! — у адзін голас крыкнулі хлопцы.

— Сьвідзецель! Вы на гэта што скажаце?

Устае сьведка, паліцэйскі стражнік.

— Сьпявалі, ваша высокародзьдзе.

— Ці ня помніце вы, што яны сьпявалі?

— Труля-ля, труля-ля! ешчэ труля-ля і ізноў труля-ля!

**Стары Шут**

**«Наша Ніва». № 31. 1907**


# Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

**Нумар падпісаны ў друк** 23.00 21.09.2007.

**Замова № 4585.**

**Рэдакцыйны адрас**: Ракасоўскага, 102–71.